Праз адукацыю – да грамадзянскай супольнасці

Брашура 8

# Супраца настаўнікаў і бацькоў у выхаванні і навучанні

Пад рэдакцыяй
Пшэмыслава Фенрыха, Уладзіміра Хільмановіча

Шчэцін 2004

Публікацыя фінансаваная ў межах Праграмы Польска-Амерыканскага Фонду Вольнасці
*Перамены ў рэгіёне –RITA*, зрэалізаванай Фондам “Адукацыя для дэмакратыі”

Праект вокладкі: Яраслаў Далецкі
Пераклад тэкстаў польскіх аўтараў: Наталля Маліноўская
Карэктура і стылёвае рэдагаванне: Ладзік Майніч
© Copyright by Wyższa Szkoła Administracji Publicznej w Szczecinie
© Copyright by Centrum Szkoleniowe Fundacji Rozwoju Demokracji Lokalnej w Szczecinie
© Фонд імя Льва Сапегі, Гарадзенскае абласное аддзяленне

Выдаўцы: Wyższa Szkoła Administracji Publicznej w Szczecinie
Centrum Szkoleniowe Fundacji Rozwoju Demokracji Lokalnej
71-332 Szczecin ul. Marii Curie-Skłodowskiej 4
tel. (48-91) 487-59-83, 486-15-69, 486-26-74
fax (48-91) 487-85-22
e-mail: sczfrdl@wsap.szczecin.pl

Грамадскае аб`яднанне „Фонд імя Льва Сапегі”
Гарадзенскае аддзяленне
тэл.-факс (0152) 76-44-95
e-mail: khilmanovich@tut.by

ISBN: 83-88044-62-1

# ПРАДМОВА

Школа ёсць, ці прынамсі мусіць быць, месцам, дзе фармуецца асабовасць чалавека, у тым ліку і як грамадзяніна, гатовага браць на сябе адказнасць за сваё асяроддзе. Гэтае фармаванне асабовасці рэалізуецца ў межах, вызначаных праграмай адукацыйных дзеянняў, але яшчэ ў большай ступені ў спосабах наладжвання стасункаў трох груп, якія ствараюць школьную супольнасць: вучняў, настаўнікаў, бацькоў. Прынцыповую ролю ў фармаванні гэтых стасункаў адыгрывае адміністрацыя школы, цэнтральнай асобай якой мусіць быць, зразумела, дырэктар.

Як выглядае сітуацыя ў сучаснай беларускай школе? Ці ўсе вышэй пералічаныя сегменты школьнай супольнасці маюць дастаткова свабоды, каб браць на сябе адказнасць за сённяшні стан і будучыню беларускай адукацыі? Ці ёсць на Беларусі асяродкі, зацікаўленыя адукацыяй, якія лічаць цяперашнюю сітуацыю настолькі неадпаведнай, што гатовыя прысвяціць сваю дзейнасць таму, каб гэта змяніць? Гэта вельмі важна, бо наступствы адсутнасці такой працы могуць быць жахлівыя: вырастуць новыя пакаленні жыхароў Беларусі без разумення, чым можа быць сведамая грамадзянская актыўнасць, схільных да паталогіяў і не адпорных на прапаганду.

Рэформа адукацыі мусіць уводзіцца зверху, але польскі досвед паказвае, што вельмі добра, калі рэформа інспіруецца пошукамі і націскам знізу. Гэтыя пошукі распачынаюцца зазвычай з распаўсюду перакanання, што пра змены сістэмы школьніцтва на Беларусі думаць варта і трэба. А таксама з таго, што мысленне мусіць ахопліваць стварэнне новых стасункаў, новых форм супрацы настаўнікаў і бацькоў. Звычайная змена ў арганізацыі бацькоўскага сходу, якая будзе палягаць у новай расстаноўцы партаў і крэслаў у класе, можа спачатку паказаць бацькам, што ў школе яны мусяць не толькі слухаць, але могуць пра яе размаўляць. Пасля будзе перакананне, што ў дачыненнях з школай яны могуць быць партнёрамі, што на вызначаных прынцыпах яны могуць і павінны браць удзел у жыцці школы для дабра сваіх дзяцей і сваёй супольнасці. Менавіта ў супрацы сям'і і школы нараджаецца супольнасць свабодных людзей, салідарных і адказных.

Надзвычай важнай ёсць постаць настаўніка. Нягледзячы на ніякія палітычныя рэжымы, варункі працы, ад асобы настаўніка залежыць вельмі шмат. Калі ж творчы адкрыты настаўнік бярэ ў саюзнікі бацькоў, верагоднасць плёну яго працы расце. Падаецца, што добрым выхаваўцам і настаўнікам можа быць толькі той, хто здольны сам вучыцца. Незалежна ад веку, пасады і роўню адукацыі. У савецкія часы бясконца заклікалі: “Вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца!”. Гэты пусты лозунг аніяк не напаўняўся сэнсам альбо зводзіўся да прымітыўнага механічнага назапашвання пэўных ведаў. Такое накапленне ведаў ні ў духоўным, ні ў матэрыяльна-практычным плане амаль нічога не давала. Бо трэба вучыцца асэнсавана і з душой. Трэба вучыцца любіць і

шанаваць чалавека, трэба вучыцца ўжыццяўляць здабытыя веды, урэшце трэба вучыцца думаць пра разнастайнасць свету, пра змаганне добрага і злога. Апроч навучання школа разам з сям'ёй пакліканыя выхоўваць патрыёта-грамадзяніна, чалавека, які мае адказнасць за лёс Бацькаўшчыны

Даная брашура чарговая ў серыі "Праз адукацыю да грамадзянскай супольнасці". Яна прадстаўляе пошукі шляхоў супрацы бацькоў і настаўнікаў. Аўтары рознага веку і досведу дзеляцца сваім разуменнем місіі школы. Мы паказваем польскі досвед і беларускае мысленне. І заахвочваем да ўлучэння ў размову пра адукацыю і выхаванне.

**Пшэмыслаў Фенрых, Уладзімір Хільмановіч**

Віктар Сазонаў

# Выхаваць Чалавека

(разважанні пра школу)

## Уступ

Чалавек пабудаваў гарады і дарогі, прыдумаў машыны і самалёты, стварыў дзяржавы, якія бароняць яго правы, сістэму сацыяльнай абароны, інтэрнэт, і нават зрабіў значны бытавы камфорт. Здавалася б, чалавек зрабіў усё, каб быць шчаслівым. Але яго шчасце мала залежыць ад тэхнічных здабыткаў цывілізацыі. Чалавек прагне духоўнай гармоніі. А ў сэнсе духоўнага камфорту нічога не змянілася. Дзе б і калі не праводзіліся апытанні, адказы людзей рознага часу і ў розных краінах прыкладна аднолькавыя. Разуменне шчасця людзі найперш тарнуюць не да нейкіх матэрыяльных здабыткаў, на якія губляюць большую частку свайго часу, а на такія вечныя паняткі як паразуменне ў сям'і, добрыя стасункі з сваякамі, сябрамі, блізкімі і суседзямі, а найперш з сваімі дзецьмі. Кожны чалавек дбае пра сваіх дзяцей, апякуецца імі, хоча каб яны выраслі добрымі і разумнымі людзьмі, знайшлі сваё месца ў свеце. Цяперашні чалавек будучыню сваіх дзяцей атаесамляе з атрыманнем імі *добрай адукацыі*, і *добрага выхавання*. Менавіта гэтыя функцыі ён ускладае на школу.

## Выхаванне

Выхаванне дзяцей – галоўнае заданне кожнага грамадства. Зразумела, што бацькі не мусяць пазбывацца абавязкаў па выхаванні сваіх дзяцей. Яны ёсць адказнымі за сваіх дзяцей, і ад паводзінаў найперш бацькоў залежыць, якімі вырастуць іх дзеці. Бо маленькі чалавек з дзяцінства ўбірае ў сябе на роўні падсведамасці звычкі і паводзіны бацькоў. Але як бы добра не выхоўвалі бацькі сваё дзіця, не трэба забывацца, што яно будзе жыць у грамадстве, дзе людзі розныя і кожны глядзіць па іншаму на свет. Таму школа мусіць на сябе браць місію масавага і персанальнага выхавання, даводзячы да дзяцей агульнапрынятыя грамадствам каштоўнасці нашай цывілізацыі.

Выхаванне ў школе пачынаецца з разумення школай у цэлым, і кожным настаўнікам паасобку, важнасці і неабходнасці выхаваўчага працэсу. Таму, менавіта *выхаванне мусіць быць галоўным элементам школьнай праграмы*. Школа мае заданне даводзіць да людзей галоўныя нормы паводзінаў чалавека ў грамадстве. Гэты працэс мусіць абапірацца на ўжо прынятыя чалавецтвам

базавыя нормы існавання чалавека ў грамадстве, на здабыткі цывілізацыі ў гэтай галіне, і грунтавацца на крыніцах, якія не выклікаюць сумневу.

Пакідаючы школу, малады чалавек ужо ёсць асоба, якая мусіць найперш у сваіх паводзінах абапірацца на такія рэчы як сумленнасць, чэснасць, культурнасць, цярпімасць і павага да іншых. Разумець, што такое чалавек, і што кожны чалавек мае сваю жыццёвую місію. Таму ў выхаваўчым школьным працэсе мусіць быць шырока прадстаўлена рэлігійная адукацыя. Гэта грунтоўнае вывучэнне рэлігій свету, але найперш хрысціянства. Бо Беларусь у сваім цывілізацыйным развіцці мае якраз хрысціянскія падмуркі. Таму для гарманічнага развіцця грамадства, і хрысціяне, і людзі іншых веравызнанняў мусяць добра валодаць хрысціянскім вучэннем. У адваротным разе ў грамадстве непазбежныя канфлікты на рэлігійнай глебе. Разам з тым, прадстаўнікі іншых веравызнанняў маюць права на больш дэталёвае вывучэнне сваёй рэлігіі. Таму свецкія выкладнікі рэлігійных дысцыплінаў, мусяць мець даволі грунтоўныя веды ў гэтай галіне.

Было б добра, каб працэс школьнага выхавання быў у меру цэнтралізаваны. Грамадства праз яго мела б здольнасць хутка рэагаваць на негатыўныя масавыя праявы. Бо школа ёсць адным з інстытутаў грамадства, які працуе ў звязку і гармоніі з іншымі інстытутамі. Прыкладам, сёння становіцца відавочнай неразборлівасць (асабліва сярод моладзі) у полавых зносінах, што цалкам крэсліць амаль усе набыткі еўрапейска-хрысціянскай цывілізацыі ў гэтай сферы. Робіць слабымі сем'і, павялічвае колькасць разводаў, кінутых адным ці двума бацькамі дзяцей, і як вынік, робіць нездаровым усё грамадства. Таму дзяржаўная сістэма выхавання грамадства праз школу мае магчымасць уплываць на гэты працэс, хутка увёўшы ў праграму школьнага навучання прадметы полавага выхавання. Давесці да маладога чалавека годнасць і хараство чысціні зносінаў паміж мужчынам і жанчынай, сямейных стасункаў, іх важнасць і неабходнасць як для ўсяго грамадства, так і для развіцця канкрэтнай асобы.

Выхаваўчы працэс мусіць абапірацца і на нацыянальныя традыцыі. Бо як няма карэнняў, не варта чакаць і пладоў. Прычым гэты элемент мае быць ва ўсіх гуманітарных дысцыплінах. Толькі той школьнік, які добра арыентуецца ў гісторыі, культуры, традыцыях свайго народу, зможа правільна абраць жыццёвыя арыентыры, скіраваныя і на развіццё свайго духоўнага свету, і на гарманічнае развіццё грамадства. Павага да продкаў, гонар за лепшых прадстаўнікоў сваёй нацыі і шанаванне памяці тых, хто прысвяціў жыццё свайму народу, робяць чалавека ўпэўненым у правільнасці абранага шляху, дае сілы змагацца з нягодамі і жыццёвымі цяжкасцямі.

Калі чалавек захварэе, ён ідзе да доктара і давярае таму лячыць яго. Давер базуецца на тым, што лекар валодае інфармацыяй пра чалавечае цела і ведае галоўныя працэсы, якія ідуць у арганізме. Для таго, каб вучні паверылі ў галоўныя прынцыпы маралі і этыкі, гэтыя прынцыпы таксама мусяць базавацца на галоўных ведах чалавецтва, даных яму Богам. Немажліва дасягнуць

поспехаў у выхаванні дзяцей, не давёўшы ім *што такое грэх*, чаму яго нельга рабіць, і да якіх формаў абмежавання светагляду чалавека і да дэградацыі яго як асобы набліжае грахоўнае жыццё. Пры гэтым вельмі важна не падмяняць царкоўнае разуменне граху сваім разуменнем. Таму што разуменне *дабра* і *зла* ёсць разуменнем вечным. Яго нельга падаваць з пазіцый, якія былі ў савецкай школе, дзе прыжываліся штучна-фальшывыя паняткі "сацыялістычная мараль" ці "савецкае сумленне". Мараль і сумленне не могуць вызначацца дадатковымі тэрмінамі. Бо такія "дадаткі" размываюць і нішчаць сутнасць паняткаў.

Такі падыход да выхавання чалавека ніяк не адмаўляе свецкага характару школы. Наадварот, гэты шлях прыводзіць чалавека да неабходных нормаў суіснавання з іншымі людзьмі ў свецкім грамадстве. Бо сапраўдная цярпімасць да іншай думкі, уменне паважаць іншы погляд, здольнасць слухаць людзей і пашыраць свой колагляд мажлівы толькі ў грамадстве, мараль і этыка якога базуецца на непарушных падставовых прынцыпах. Дзе такія якасці як зычлівасць, чэснасць, шчырасць, дапамога, клопат пра іншых, становяцца нормай жыцця. Дзе разуменне правільнасці і няправільнасці паводзінаў чалавека атаесамляецца з яго разуменнем граху. Ужо ў школе чалавеку трэба зразумець што такое *адказнасць*, і добра ведаць якія ў яго *абавязкі* ў сям'і, грамадстве, дзяржаве.

Неабходна каб школа брала на сябе абавязкі полавай адукацыі, дзе заняткі для дзяўчынак і хлопчыкаў праводзяцца асобна. Людзі ёсць двухполыя. У культуры зносінаў паміж поламі чалавецтва мае вялікія здабыткі. Нават у біялагічнай будове чалавечага цела (прыкладам цнота ў дзяўчынак) ужо закладзена база патрэбнай чалавеку маралі. Таму сумесная дзявоча-хлапчукоўская прысутнасць на такіх занятках прытупляе надзвычай важнае для чалавека пачуццё сораму і прыстойнасці.

Вельмі важнымі ў выхаванні ёсць і нормы паводзінаў чалавека. Культурнасць і стрыманасць, стаўленне да старэйшых, уменне нават правільна апранацца аўтаматычна ўплываюць на паводзіны ў кожнай жыццёвай сітуацыі, незалежна ад таго, сядзіць чалавек за рулём аўтамабіля, ці спрачаецца на навуковай канферэнцыі. Этыка паводзінаў абавязкова мусіць базавацца на этыцы размовы. Нельга весці дыскусію там, дзе людзі лаюцца матам, бо гэта адразу нясе нервознасць і нежаданне слухаць аргументы іншых. Уменне прыгожа размаўляць вельмі важная дэталь у выхаванні чалавека. Толькі чалавек мае дар размаўляць. З малых гадоў да яго трэба давесці веліч і прыгажосць неверагодна вялікага скарбу – роднай мовы. Яна ёсць адным з галоўных чыннікаў стварэння грамадзянскай супольнасці.

# Адукацыя

Школьная адукацыя мусіць выконваць дзве функцыі. *Даць чалавеку веды* для яго развіцця і жыцця ў грамадстве, а таксама *рыхтаваць будучых спецыялістаў*, якія будуць працаваць на развіццё дзяржаўнай зканомікі і культуры. Малады чалавек мусіць мець дастатковыя веды па ўсіх асноўных дысцыплінах. Гісторыя, літаратура і іншыя гуманітарныя дысцыпліны, а таксама прадметы хімія, фізіка, матэматыка і іншыя, якія можна назваць дысцыплінамі будучага прафесійнага выбару, мусяць утрымліваць неабходны для кожнага чалавека мінімум. Гэты мінімум у праграме школьнай адукацыі мусіць быць абавязковым. Але не трэба перагружаць праграмы. Галоўная заданне сістэмы адукацыі ў гэтай галіне – *навучыць чалавека вучыцца*, рэальна ацэньваць свае здольнасці, прыхільнасці і таленты. Для больш дэталёвага авалодання тым ці іншым прадметам было б добра, каб школа, з згоды бацькоў і абапіраючыся на здольнасці кожнага канкрэтнага вучня, увяла сістэму спецыялізацыі. Менавіта там, для таленавітых у тым ці іншым кірунку дзяцей, даваліся б паглыбленыя веды. Паглыбленае вывучэнне абраных прадметаў ёсць рыхтоўляй да будучай прафесіі. Таму яна мусіць быць вельмі мабільнай. Пад-час школьнага адукавання вучань і яго бацькі могуць мяняць накірункі паглыбленай адукацыі, у залежнасці ад прыхільнасцяў школьніка, ці выяўленнем ім новых здольнасцяў і талентаў. Прычым, уся сістэма адукацыі мусіць працаваць на гэта. Пры паступленні ў пасляшкольныя навучальныя ўстановы мусяць улічвацца не ўсе адзнакі, а толькі тыя, якія адпавядаюць асноўнаму профілю канкрэтнай навучальнай установы. Гэта дазволіць дзяржаве больш аб'ектыўна адбіраць будучых спецыялістаў, а маладым людзям шукаць месца далейшай вучобы і працы адпаведна здольнасцям. Трэба каб на гэтых прадметах была цвёрдая дысцыпліна і высокія патрабаванні. Школьніку трэба ўсведаміць, што нічога не даецца задарма, што каб дасягнуць поспеху, трэба працаваць, што гэта ўжо ёсць яго праца. Але такое стаўленне ў школе дапушчальна толькі на абраных прыярытэтнымі дысцыплінах.

Абавязкова школа мусіць выкладаць тыя прадметы, якія патрэбныя ў жыцці кожнаму чалавеку. Найперш гэта добрае валоданне кампутарам, уменне карыстацца інтэрнэтам. Вельмі важным ёсць добрае валоданне некалькімі замежнымі мовамі. Неабходнымі ёсць бухгалтарска-фінансавая справа, падаткавая сістэма, асновы прадпрыманніцтва, вядзенне дакументацыі, навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасці, карыстанне архівамі і бібліятэкамі.

Таксама вельмі патрэбнае працоўнае навучанне, фізкультура, кіраванне аўтамабілем, музычная культура і маляванне. Але не трэба, прыкладам на фізкультуры, з дзяцей рабіць спартоўцаў (акрамя спецыялізаваных класаў). Найперш трэба дзяцей навучаць на фізкультуры як правільна схіліцца, без шкоды для пазваночніка, каб зашнураваць абутак. Як правільна насіць

школьныя падручнікі, у якой торбе і якой максімальнай вагі. Якую і калі трэба рабіць ранішнюю гімнастыку, колькі гадзінаў трэба быць на свежым паветры. Як тэорыю абавязкова маладому чалавеку ведаць гісторыю нацыянальнага і сусветнага спорту, лепшыя спартовыя дасягненні. Тое сама і на маляванні і музычнай культуры. Дзяцей трэбы вадзіць па музеях і канцэртах, выхоўваць музычны і мастацкі густ, сумесна праглядаць і абмяркоўваць на занятках лепшыя творы сусветнай кінематаграфіі.

Працоўнае навучанне мае галоўнай мэтай навучыць чалавека прасцейшым рэчам. Памагчы бацькам па хаце, памыць падлогу, забіць цвік, азнаёміцца з бытавымі прыладамі працы і навучыцца імі карыстацца. Лепш каб працоўнае навучанне і фізкультура для хлопчыкаў і дзяўчынак праходзілі па розных праграмах, адпаведна іх полу.

Вельмі патрэбныя чалавеку і заняткі па медыцыне, першай медыцынскай дапамозе, а для хлопчыкаў яшчэ і асновах вайсковай справы. Гэта дапаможа ім адчуць большую адказнасць за сваю Краіну і навучыцца валодаць зброяй. Гэта вельмі важна. Чалавек з дзяцінства мусіць быць гатовым і фізічна бараніць дабро ад зла. Тым больш, што кожны мужчына ёсць ваеннаабавязаны. Чалавеку з самога дзяцінства неабходна разбірацца і ў пытаннях дзяржаўнасці, дзяржаўным ладзе, нормах дэмакратыі, стасунках паміж дзяржавамі і асновах палітычнай будовы іх Краіны. Бо чалавек ужо ў школе фармуецца выбарцам, і пачынае адчуваць адказнасць за сваю Радзіму. Важнымі ёсць і дысцыпліны вывучэння грамадства, навакольнага асяроддзя, экалагічная адукацыя, разуменне сям'і і народу.

Патрэбна працаваць і над псіхалагічным кліматам у школьных асяродках. Гэта і ананімнае анкетаванне (каб вучні маглі выказаць свае думкі без ціску), і рознага кшталту мерапрыемствы, і абавязкова свая газетка ў кожным класе. Чалавек з маленства мусіць навучыцца бараніць свае погляды публічна, мець мажлівасць іх выказаць.

## ШЛЯХІ КАНТРОЛЮ І ДАСКАНАЛЕННЯ

Такія важныя працэсы як выхаванне і навучанне дзіцяці ні ў якім разе нельга пакідаць без кантролю з боку бацькоў, грамадства, адпаведных структураў міністэрства адукацыі і дзяржавы. Але гэты працэс мусіць быць вельмі прадуманы і аб'ектыўны. Абавязковай умовай ёсць стварэнне сістэмы кантролю.

Многія дысцыпліны, такія як дакладныя навукі, паглыбленыя веды па дысцыплінах у сістэме спецыялізацыі, і прадметы, дзе прадугледжваецца абавязковым неабходны мінімум ведаў, мусяць праходзіць іспыты і тэставанні, ацэньвацца ў балах. Пры гэтым на іспыты і тэставанні трэба запрашаць бацькоў, каб тыя рэальна ведалі ровень ведаў сваіх дзяцей, і маглі больш

дакладна вызначыцца наконт выбару прафесіі іх сыноў і дочак. Настаўнікаў на такія іспыты лепш запрашаць з іншых школаў. А таксама прадстаўнікоў вышэйшых установаў сістэмы адукацыі. Гэта будзе адначасна праверкай працы настаўнікаў. Такая камісія, улучаючы і бацькоў, складзе рэкамендацыі наконт ведаў вучня. Але канчатковую адзнаку мусіць выстаўляць той настаўнік, які цягам году выкладаў у даным класе. Высновы камісіі, у якой будуць і прадстаўнікі вышэйшых навучальных установаў, носяць рэкамендацыйны характар не толькі настаўніку, але і бацькам.

Такія дысцыпліны як маляванне, спевы, фізкультура не могуць ацэньвацца па балавай сістэме, а толькі вызначэннем "залік", ці "не залік". Прычым залік трэба ставіць паводле факту вучня на занятках і праслухоўвання ім навучальнага курсу. Ніхто не можа ацаніць хто маляваў лепш, Рэмбрандт ці Малевіч. Таму на такіх дысцыплінах трэба менавіта так адзначаць веды вучня.

Дысцыпліны звязаныя з светаглядам, дзяржаўным ладам, пабудовай грамадства, філасофіяй і, сама галоўнае, – з выхаваннем чалавека не могуць ацэньвацца ні па якой сістэме. Ніхто не мае права ацэньваць чалавека як асобу (нават маленькага чалавека), па нейкай шкале. Таму заняткі па гэтых дысцыплінах мусяць ісці па інтэрактыўных методыках, ці проста ў гутарках, на якія пажадана запрашаць бацькоў (прысутнасць па жаданні), экспертаў, людзей заслужаных перад грамадствам, ці проста старэйшых, з багатым жыццёвым досведам. На гэтых занятках аўдыторыя (зразумела што пад наглядам спрактыкаванага педагога) мусіць калектыўна, але сама, прыходзіць да пэўных высноваў пытанняў маралі і этыкі. Відавочна, што тут таксама трэба давесці да дзяцей хоць бы мінімум ведаў, які базуецца на неабвяргальных крыніцах. Але ні ў якім разе не ставіць адзнакаў.

Па гэтых дысцыплінах трэба правяраць школу. Прадстаўнікі кантрольных структураў мусяць назіраць не за метадамі правядзення заняткаў настаўнікамі, а за вынікамі іх працы. Паглядзець чым займаюцца дзеці канкрэтнай школы на перапынках і пасля заняткаў, ці кураць яны ў прыбіральнях, ці лаюцца матам, які псіхалагічны клімат у класе і гэтак далей.

Для такой сістэмнай працы патрэбнымі ёсць курсы падвышэння кваліфікацыі настаўнікаў і адміністрацыі школы. Там прысутныя могуць азнаёміцца з найноўшымі методыкамі правядзення такіх заняткаў, абмяняцца досведам, сумесна скласці свае праграмы навучання і падаць іх на зацверджанне ў міністэрстве.

## Заканчэнне

Галоўнае заданне школы – выхаваць асобу, навучыць чалавека жыць у згодзе з сваім сумленнем і грамадствам, даць неабходныя для жыцця веды. Тэхнакратычны век прывёў грамадства да пэўнага дысбалансу. Развіццё

тэхналогій апярэдзіла развіццё гуманітарнай сферы. А дзеля гарманічнага развіцця грамадства патрэбен паралельны рух наперад як тэхналогій, так і гуманітарнага кірунку. Таму заданне сённяшняй школы – не толькі даць чалавеку патрэбныя тэхнічныя веды, каб ён быў добрым спецыялістам і мог зарабляць на годнае жыццё. Галоўная мэта школы – выхаваць гарманічную Асобу, якая ў сваіх паставах і паводзінах кіруецца найперш паняткамі справядлівасці і праўды. Высокія тэхналогіі, калі трапляюць у рукі несумленных людзей, прыносяць непапраўную шкоду. Заданне грамадства – не толькі далей паляпшаць тэхнічныя здабыткі, за якімі ідзе дабрабыт, але і будаваць чалавечую супольнасць так, каб гэтыя здабыткі не нашкодзілі ёй. Чалавек мусіць дбаць пра будучыню цывілізацыі, будучыню сваіх дзяцей і пра сваю душу. І рыхтаваць яго да гэтага трэба з маленства. Менавіта гэтым, разам з бацькамі і дзяржавай мусяць займацца школы.

**Віктар Сазонаў** – гісторык і палітык, публіцыст, старшыня Гарадзенскай філіі Грамады. Аўтар і кіраўнік шэрагу адукацыйна-асветных праграмаў Гарадзенскага абласнога аддзялення грамадскага аб’яднання “Фонд імя Льва Сапегі”, рэдактар інфармацыйна-аналітычнага бюлетэню “Свой Лад”.

Богдан Хэнць

# Паміж правам і рэчаіснасцю

*Арбітральная школьная сістэма не можа выхаваць будучых грамадзянаў-дэмакратаў.*
*Цалестын Фрайнет*

У эпоху дэмакратыі, калі ўсе народы адзін за адным здабываюць незалежнасць, школа мусіць стаць школай дэмакратычнай і рыхтаваць сваім прыкладам і сваёй дзейнасцю сапраўдную дэмакратыю. (Ц. Фрайнэт, Невядомыя педагагічныя ісціны. Атвоцк, 1993 г.)

Згодна з такім меркаваннем у Польшчы адным з першых крокаў, звязаных з усталяваннем новай дэмакратыі, былі дзеянні, скіраваныя на змену сістэмы адукацыі. Да найвышэйшых поспехаў гэтага перыяду трэба залічыць рух сведамых бацькоў за ўтварэнне недзяржаўнага школьніцтва. Найважнейшай ініцыятывай стала заснаванне колам настаўнікаў і бацькоў Грамадскага таварыства асветы, школы якога вельмі хутка пачалі дзеіць па ўсёй краіне, у вельмі розных месцах, ад вялікіх гарадоў да малых і нават вельмі малых мястэчкаў. Там шанцы на дэмакратызацыю школы былі і ёсць сама вялікія. Нягледзячы на з'яўленне ўсё большай колькасці недзяржаўных школ, аснову польскай сістэмы асветы ствараюць аднак дзяржаўныя школы.

Прыняты ў 1991 годзе *Закон аб сістэме адукацыі* ўвёў новыя органы, якімі ёсць Рада школы і Асветныя рады. Змяніліся таксама і запісы, якія рэгулююць дзейнасць Вучнёўскага самакіравання і Рады бацькоў. Менавіта яны, а таксама Педагагічная рада мусяць мець найбольшы ўплыў на працэс дэмакратызацыі школ.

Школа – гэта арганізм, які ў роўнай ступені ствараюць настаўнікі, бацькі і вучні. Адзін з спосабаў пераходу ад школы, падпарадкаванай таталітарнай сістэме, да школы дэмакратычнай – прыйманне адказнасці за яе форму і распачынанне адпаведных працэсаў усімі чыннікамі школьнай супольнасці. Кожны з трох бакоў школьнай супольнасці мае свае прадстаўніцтвы: настаўнікі – Педагагічную раду, вучні – Вучнёўскае самакіраванне, бацькі – Бацькоўскую раду. Органам, які дае ўсім бакам працэсу адукацыі ў дзяржаўным школьніцтве агульнае права рашэння, ёсць Рада школы. У яе склад уходзяць па роўнай колькасці прадстаўнікоў ад настаўнікаў, вучняў і бацькоў (з 2000 году, пасля змены структуры школьніцтва, у 6-гадовых пачатковых школах няма прадстаўніцтва вучняў).

Аналізуючы розныя прававыя дакументы, можна пералічыць наступныя паўнамоцтвы Рады школы:

– Рада школы рэцэнзуе праекты інавацый і педагагічных эксперыментаў у школе;

– Рада школы ацэньвае працу дырэктара, таксама падчас ацэньвання яго працы кантрольным органам;

– Ацэньвае працу дырэктара школы, якому даверана гэтая пасада на перыяд меншы за адзін навучальны год;

– Рада школы выказвае меркаванне наконт кандыдата на пасаду дырэктара школы;

– Рада школы рэцэнзуе фінансавы план школы;

– Рада школы рэцэнзуе план працы школы;

– Рада школы выказвае меркаванне па ўсіх іншых справах, важных для школы;

– Па ўласнай ініцыятыве ацэньвае сітуацыю, а таксама стан школы;

– Можа выступіць з заявай праверыць і ацаніць дзейнасць школы, яе дырэктара або настаўніка;

– Рада школы робіць прапановы ў гадавы фінансавы план адмысловых сродкаў школы;

– Рада школы можа выступаць з заявай аб скліканні пленарнага сходу Педагагічнай рады;

– Рада школы разглядае заявы і меркаванні Бацькоўскай рады і Вучнёўскага самакіравання;

– Рада школы зацвярджае статут школы або змены ў ім;

– Рада школы можа збіраць сродкі.

Калі да ўсіх гэтых паўнамоцтваў дадаць яшчэ тыя, якія тычацца Вучнёўскага самакіравання, а асабліва Бацькоўскай рады, а таксама магчымасці, якія ствараюць юрыдычныя нормы для заснавання арганізацый, то выяўляецца даволі шырокае поле дзейнасці ў абшары дэмакратызацыі школы.

Як выглядае рэчаіснасць з гэтага гледзішча? Мой досвед паказвае залежнасць роўню актыўнасці на гэтым полі дзейнасці ад роўню актыўнасці і адкрытасці бацькоў, а найперш дырэктара школы. Тут варта заўважыць, што ёсць два віды аўтаноміі школы. Першы з іх – гэта вонкавая аўтаномія, тое, што дае нам законадаўства. У гэтым абшары заўважаецца шмат станоўчага, хоць гэта яшчэ не ідэальны вобраз. Другі від аўтаноміі, куды важнейшы для дэмакратызацыі школы – гэта ўнутраная аўтаномія, тое, наколькі школьная супольнасць, канкрэтныя асобы гатовыя дзеіць. Колькі ў іх адвагі, мудрасці, трывання і цярплівасці каб змяняць тое, што здаецца непарушным.

Адукацыя – гэта сфера жыцця, змены ў якой патрабуюць часу, яна не прызнае спешнасці, гвалтоўнага дзеяння і браку прафесійнай рыхтоўлі. Таму змены заўважаюцца павольна. Я падам два прыклады дзеянняў, у якіх я быў ініцыятарам і ў якіх я браў удзел.

Першы тычыцца будовы плоскасці для дыялогу і партнёрства сярод настаўнікаў, бацькоў і вучняў. Гэта адбываецца метадам малых крокаў, патрабуе паступовага асвоення з новай рэчаіснасцю, у якой мы зычліва пільнуем адзін другога, але і рэалізуем супольныя дзеянні для справы

добрай адукацыі. У сітуацыі з настаўнікамі сярэдняй школы № 61 у Шчэціне метад малых крокаў палягаў у паступовых ўводзінах зменаў. Спачатку быў доступ да артыкулаў і літаратуры, звязаных з іншым успрыманнем школы. Потым былі сустрэчы з настаўнікамі і адукацыйныя візіты ў школу з Еўрапейскай сеткі школ Здароўя, якія паказвалі, што можна ствараць іншыя школы. Потым былі практычныя заняткі для групы лідараў. Укаранаваннем стаў цыкл васьмі двухдзённых выяздных адукацыйных семінараў для настаўнікаў, якія праводзіў прадстаўнік Польшчы ў Еўрапейскім таварыстве бацькоў (EPA), псіхолаг Міхал Кавэцкі. Характэрнай рысай тых заняткаў былі ахвотнасць удзелу, цяжкая праца, мой, як дырэктара школы, актыўны ўдзел ва ўсіх занятках, а таксама тое, што паралельна з працай настаўнікаў праводзіліся семінары для бацькоў і Вучнёўскага самакіравання. Цяжка пераацаніць вынікі гэтай нялёгкай працы, але трэба таксама памятаць, што школа, як сад, патрабуе сталага дагляду і цеплыні, а таму патрэбны працяг, які пастаянна інспіруецца і падтрымоўваецца. Вельмі канкрэтным вынікам гэтых дзеянняў быў вялікі пералік патрэбаў і чаканняў вучняў, бацькоў і настаўнікаў. Ён вызначыў шмат абшараў для далейшай дзейнасці.

Другім прыкладам дзеянняў, якія спакваля даюць добрыя плады, ёсць прафесіяналізацыя і актыўнасць бацькоў у межах арганізацыі. Шлях да пазіцыі, якую выпрацавала Заходнепаморскае таварыства бацькоў, быў доўгім. Асноўную ролю на гэтым шляху адыгралі семінары для бацькоў, рэгулярныя канферэнцыі як на лакальным, так і на агульнадзяржаўным і міжнародным роўнях, а таксама магчымасць кантакту з EPA. Няма больш эфектыўнага спосабу для ўлучэння новых сяброў і саюзнікаў, чым канкрэтныя дзеянні з вынікам. Таму таварыства падтрымоўвае бацькоў у іх прафесіяналізацыі і ўменні выкарыстоўваць правы, пералічаныя ў асветным заканадаўстве. Яно падтрымоўвае таксама Вучнёўскае самакіраванне, якое ёсць будучыняй дэмакратычнай адукацыі.

Напрыканцы асабістая рэфлексія. Я думаю, што ўсе змены мусяць спачатку адбыцца ў нас самых. Гэта мы мусім быць гатовымі на змены, гатовымі на цяжкую працу, не неразуменне іншых. Нават сама старанны і сама здольны настаўнік, вучань ці бацька не могуць зрабіць усяго самастойна. Трэба паклапаціцца пра групу падтрымкі, якая дасць нам пэўнае пачуццё бяспекі. Важную ролю маюць аўтарытэты і прафесіяналы, якія часам стаяць на нашым шляху, а часам іх трэба пашукаць – гэта сапраўды варта. Добры вынік пэўных ініцыятываў вызначаюць канкрэтныя людзі, іх матывацыі, актыўнасць, энтузіязм і мудрасць у дзеянні. Але трэба выканаць умовы, якія спрыяюць актыўнасці аб’ектаў адукацыі. Бацькі ахвотна ўлучаюцца ў жыццё тых школ, дзе дырэктары і настаўнікі ёсць прыхільнікамі партнёрства і адчуваюць патрэбу такіх стасункаў з бацькамі. Важна, каб справа не заканчвалася на дэкларацыях. Бацькі і вучні мусяць адчуваць, што з іх голасам і меркаваннем лічацца, а сустрэчы – “бацькоўскія сходы” – адбываюцца ў форме дыялогу, а не

маналогу настаўніка. Так, патрэбна немалое намаганне і значная пакора з боку педагагічных кадраў, каб заахвоціць бацькоў да актыўнага ўдзелу ў стварэнні школы.

**Богдан Хэнць** – настаўнік прыродазнаўства і дырэктар сярэдняй школы № 61 у Шчэціне. Быў адным з арганізатараў Форуму Бацькоўскіх радаў у Шчэціне, які пераўтварыўся ў Заходнепаморскае таварыства бацькоў. Адзін з арганізатараў заняткаў Настаўніцкай Акадэміі і Бацькоўскай Акадэміі. Жанаты, мае адно дзіця.

*Пераклад з польскай мовы Наталлі Маліноўскай*

Вольга Ахрук

# КІРАВАННЕ І САМАКІРАВАННЕ Ў БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЕ – МАГЧЫМАСЦІ І ЎПЛЫЎ ГРАМАДСТВА

Беларуская школа ўжо працяглы час у стане рэфармавання, аднак, без станоўчых вынікаў. Нягледзячы на дэкларавану дэмакратызацыю, рэформы не закранаюць праўных і структурна-арганізацыйных аспектаў кіравання школай, якія б рэгулявалі дачыненні ў сферы адукацыі паміж усімі зацікаўленымі бакамі. Зразумела, што існаванне ўстойлівай сістэмы адукацыі, здольнай нармальна функцыянаваць ва ўмовах дынамічнага развіцця сучаснага грамадства, патрабуе наяўнасці эфектыўных механізмаў кіравання і самакіравання. Беларуская ж школа і надалей захоўвае традыцыі савецкай адукацыі, такія, як аўтарытарнасць, ідэалагізаванасць, адсутнасць матывацыяў і рэальных магчымасцяў для творчай працы. Пры гэтым тыражуецца паслушэнства, лаяльнасць, адданасць кіраўніцтву, савецкая ментальнасць.

Яшчэ ў эпоху асветніцтва, у 18 стагоддзі, было зразумела, калі дзяржава імкнецца стаць моцнай і адэкватна рэагаваць на выклікі часу, патрабуюцца па-іншаму выхаваныя і адукаваныя грамадзяне. “Народная адукацыя – гэта фармаванне сэрцаў і розумаў… Не трэба тлумачыць панству стану нашай айчыны. Якія грамадзяне, такая і айчына, якое выхаванне моладзі – такія і грамадзяне” – тлумачыў на сустрэчах з рэктарамі школ Літоўскай правінцыі ў пачатку правядзення рэформаў Яўхім Храптовіч. Каб з’явілася новае пакаленне маладых людзей і настаўнікаў, быў зроблены шэраг крокаў у кірунку стварэння так званага настаўніцкага саслоўя. Яму, паводле пастановы Адукацыйнай камісіі 1790 г., даваўся дазвол на адміністрацыйную і судовую аўтаномію, самакіраванне ў справах нутранога жыцця, свабоду ад дробязнай апекі касцёла.

Сёння камандна-адміністрацыйная сістэма кіравання блакуе фармаванне рэальнай базы для росту грамадзянскай супольнасці і з’яўлення элітаў новага пакалення, а адсутнасць пераемнасці з традыцыямі выхавання і навучання Віленскага ўніверсітэту, Полацкага калегіюму і інш, прывяла да адсутнасці нацыянальных традыцый у адукацыі і татальнага пераносу тэндэнцый развіцця адукацыі з Расіі.

Зразумела, што нельга чакаць ад сістэмы адукацыі, што яна стане лідарам дэмакратызацыі ў грамадстве, але можна спадзявацца на тое, што новае пакаленне выпускнікоў не папоўніць слаі кансерватыўна настроенага грамадства, а стане ў шэрагі актыўных і вольных грамадзян, здольных самастойна прымаць развязанні і адказваць за сваё жыццё. Сённяшняя беларуская школа нездатная выканаць гэтае заданне.

# Законадаўчыя аспекты школьнага кіравання і самакіравання

Ёсць тры асноўныя дакументы, якія рэгулююць функцыянаванне школы. Гэта Закон “Аб адукацыі”, Палажэнне Міністэрства адукацыі аб адпаведнай навучальнай установе і Статут школы.

У 1991 годзе за подпісам старшыні Вярхоўнай Рады Беларусі Станіслава Шушкевіча быў прыняты Закон “Аб адукацыі”, значную ролю ў рыхтоўлі якога адыграла фракцыя БНФ у Вярхоўнай Радзе. У адным з артыкулаў гэтага закону дэкларуецца не толькі дзяржаўная, але і грамадска-дзяржаўная форма кіравання адукацыяй.

Аднак ўжо ў 1997-1999 гадах гэты прынцып фактычна быў скасаваны і застаўся толькі фіктыўна, на паперы. Пастанова Рады Міністраў ад 12 красавіка 1999 г., № 500 “Аб асноўных кірунках развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі” практычна адмаўляе тое, што рабілася з 1991 г., ужыццяўляе вяртанне да ідэяў 1984 г. Вось цытата з гэтага дакументу: “Дасягненне мэты рэфармавання прадугледжвае захаванне і развіццё найлепшых якасцяў сістэмы адукацыі, што ўзніклі ў савецкі перыяд…”

У 2002 годзе быў прыняты новы Закон “Аб адукацыі”, у якім таксама ў артыкуле 44 дэкларуецца прынцып дзяржаўна-грамадскага кіравання адукацыяй. Аднак далей у законе гэты ж прынцып і скасоўваецца самой працэдурай стварэння органаў самакіравання: “Палажэнне аб органах самакіравання мусіць зацвярджацца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь”. Такім парадкам, дзяржавай блакуецца сапраўды грамадскі механізм кіравання адукацыяй і забяспечваецца яго поўная падкантрольнасць.

Акрамя таго, ў новай версіі закону выкрэслены артыкул аб гаспадарчай дзейнасці навучальных установаў, скасаваная падначаленасць Міністэрства адукацыі парламенту і інш.

Сістэма кіравання адукацыяй ёсць па сутнасці міні-копіяй сістэмы кіравання краінай, значыць пабудаваная паводле прынцыпу “вертыкалі”. Структурныя элементы сістэмы выконваюць толькі кантрольна-ідэалагічныя функцыі, таму можна казаць пра цэнтралізаванасць адукацыйнай сістэмы і яе закрытасць для грамадства.

Трэба адзначыць і той факт, што вельмі мала адмыслова падрыхтаваных кіраўнічых кадраў усіх роўняў. Панятак “мэнэджэр у сферы адукацыі” яшчэ не прыняты ў агульнай практыцы і , як вынік, адсутнічае кваліфікаваны адбор пры займанні кіроўных пасадаў.

Падсумоўваючы, можна сказаць, што Закон ад 2002 г.проста фіксуе існы стан рэчаў, адмаўляе магчымасці для змены адукацыі.

Яшчэ адзін важны дакумант, які рэгулюе дзейнасць установы адукацыі – гэта Статут. Статут прымаецца Радай школы раз у пяць год, але кожны год у ім могуць прымацца папраўкі.

Статут установы адукацыі мусіць утрымліваць між іншым: парадак кіравання дзейнасцю ўстановы адукацыі, у тым ліку кампетэнцыі заснавальніка, структуру і парадак фармавання органаў кіравання і самакіравання, парадак прызначэння кіраўнікоў, іх кампетэнцыі і арганізацыю дзейнасці, парадак кантролю за дзейнасцю ўстановы адукацыі; правы і абавязкі ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу; парадак зменаў і дапаўненняў у статут і інш.

Статут установы адукацыі зацвярджаецца яго заснавальнікам.

Здаецца, усё як мае быць, але ж на практыцы большасць вучняў школ, іх бацькоў і нават настаўнікаў не азнаёмленыя з зместам Статуту, частка зусім не ведае пра яго. Часам і сам змест Статуту заблытаны. Прыкладам, дэкларуецца, што вышэйшым органам школьнага самакіравання ёсць школьная канферэнцыя, але пры тым няма інфармацыі пра рэгламент яе дзейнасці, склад, паўнамоцтвы і г.д.

Зыходзячы з законадаўчай базы, сістэма школьнага кіравання і самакіравання можа быць прадстаўленая наступнай схемай:

1. Органы кіравання і самакіравання:
2. Адміністрацыя школы (дырэктар, наменікі дырэктара).
3. Рада школы (прадстаўнікі адміністрацыі, настаўнікаў, бацькоўскіх камітэтаў і вучнёўскага самакіравання).
4. Бацькоўскія камітэты (абіраюцца ў кожным класе).
5. Органы вучнёўскага самакіравання.
6. Педагагічная рада школы (адміністрацыя школы, настаўнікі).
7. Савет прафілактыкі (орган, які займаецца развязаннем дысцыплінарных пытанняў; складаецца з прадстаўнікоў адміністрацыі школы, класных кіраўнікоў, бацькоў, вучнёўскага самакіравання, а таксама ў яго склад уходзяць псіхолаг і сацыяльны педагог).
8. Апякунчыя саветы (прадстаўнікі арганізацый, бацькоў, якія могуць дапамагаць школе як фундатары).



Такім парадкам, з аднаго боку існае законадаўства дае пэўную базу для эфектыўнай арганізацыі школьнага жыцця і ўзаемадзеяння розных бакоў школьнага грамадства, а з іншага – блакуе рэальнае ўжыццяўленне прынцыпаў дэмакратычнага кіравання і школьнага самакіравання. Гэтаму садзейнічае і нізкі ровень прававой культуры як дзяцей, так і дарослых.

Школьнае грамадства ўяўляе па сутнасці трохкутнік, які ствараюць вучні, бацькі і настаўнікі разам з адміністрацыяй школы. І зразумела, каб гэтае грамадства дынамічна развівалася і сваёй дзейнасцю прыносіла плён, кожная яго частка мусіць мець магчымасці для самарэалізацыі і права голасу ў арганізацыі школьнага жыцця.

## Вучнёўскае самакіраванне

Артыкул 48 Закону Рэспублікі Беларусь “Аб адукацыі” ад 2002 г. дэкларуе права вучняў на ўдзел у кіраванні ўстановай адукацыі праз дзейнасць у органах вучнёўскага самакіравання.

Вучнёўскае самакіраванне можна падзяліць на наступныя катэгорыі:

1. Неіснае (фіктыўнае) самакіраванне, якое ёсць толькі намінальна, на паперы.
2. Рэпрэзентатыўнае самакіраванне. Пры такой схеме самакіраванне актыўна дэкларуецца, але па сутнасці не прымае ніякага дзейснага ўдзелу ў жыцці школы, можна сказаць яго роля – быць “рэкламным шчытом”.
3. Самакіраванне, у якім настаўнік мае ролю не апекуна, а кіраўніка, вызначае кірункі дзейнасці органаў вучнёўскага самакіравання, прымае пастановы і г.д.
4. Самакіраванне, заснаванае на супрацы паміж вучнямі, настаўнікамі, бацькамі і адміністрацыяй школы.

Якім ёсць вучнёўскае самакіраванне ў кожнай асобнай школе ў значнай ступені залежыць ад агульных прынцыпаў кіравання школай, а часам і ад стаўлення дырэктара школы.

У цэлым, на сённяшні дзень цяжка казаць пра эфектыўнае функцыянаванне вучнёўскага самакіравання ў беларускай школе. Пачасціліся выпадкі, калі пытаннямі арганізацыі вучнёўскага самакіравання пачынаюць займацца прадзяржаўныя моладзевыя арганізацыі - БРСМ (Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі) і БРПА ( Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя). З гэтай прычыны вельмі цікава выглядаюць і самы палажэнні аб вучнёўскім самакіраванні, якія лёгка знайсці на інтэрнет-старонках той або іншай школы. Для прыкладу падам вытрымкі з аднаго такога палажэння:

*Палажэнне аб арганізацыі і развіцці вучнёўскага самакіравання на 2001-2005 г.г.*

Вышэйшымі органамі вучнёўскага самакіравання ў вучнёўскім калектыве ёсць:

- канферэнцыя на роўні вучнёўскага самакіравання;
- вучнёўскі сход на роўні класу;
- сход першаснай ячэйкі арганізацыі БРСМ на роўні школы;
- збор дружыны на роўні піянерскай дружыны БРПА;
- збор-прывал дзіцячай школьнай масавай арганізацыі "Сонейка"…

1. Вучнёўская рада складаецца з Прэзідэнта, віцэ-прэзідэнта, прадстаўнікоў Рады, у яе склад уходзяць сакратар першаснай арганізацыі БРСМ, старшыня Савету дружыны, старшыня Савету сябраў арганізацыі "Сонейка".
2. Ачольвае Раду Прэзідэнт школы.
3. Прэзідэнт – выбарная асоба вучнёўскага самакіравання.

   Паўнамоцтвы Прэзідэнта школы:

   а) ёсць галавой вучнёўскага калектыву школы, прыкладам сучаснага, адукаванага, культурна развітага, палітычна граматнага лідара, тварам вучнёўскага калектыву школы;

   б) прызначае прэм'ер-міністра і фармуе школьны ўрад – кабінет міністраў, прымае іх адстаўку, прызначае міністраў…
4. Кабінет міністраў.

   У склад кабінета міністраў уходзяць міністэрствы: адукацыі, нутраных спраў, юстыцыі, па надзвычайных сітуацыях і г.д.

   Пры кабінеце міністраў працуе лектарская інфармацыйна-прапагандысцкая група…

У арганізаваных згодна такім палажэнням органах вучнёўскага самакіравання па-сутнасці будуецца "вучнёўская вертыкаль", а быццё сябрам адной з вышэйзгаданых моладзевых арганізацый адпаведна дае квіток да ўходжання ў "уладныя структуры".

І тут хачу звярнуць увагу на такі момант. У амерыканскіх школах вучнёўскае самакіраванне адлюстроўвае схему кіравання і самакіравання на роўні краіны. І гэта лічыцца правільным, бо ў пэўным сэнсе вучнёўскае самакіраванне – гэта школа прававога навучання дзяцей, навучання прынцыпам арганізацыі і функцыянавання дзяржаўных структур і т.д.. Асноўнае яго заданне – сфармаваць у кожным маладым чалавеку грамадзяніна сваёй краіны, здольнага выконваць канстытуцыйныя нормы паводзін у стасунках да дзяржавы і людзей, грамадзяніна, які ведае свае правы і абавязкі, а таксама паважае правы іншых. У сітуацыі беларускіх школ схема арганізацыі вучнёўскага самакіравання таксама ёсць копіяй структуры кіравання і самакіравання дзяржаўнага. І з гэтага боку ўсё цалкам лагічна. Іншае пытанне, ці адпавядае такая арганізацыя і структура закладзеным у яе намінальна прынцыпам дэмакратыі, ці сапраўды навучае асноўным грамадзянскім паставам?

Прыхожу да высновы, што эфектыўнае і дзейснае вучнёўскае самакіраванне магчымае толькі ў такой школе, дзе прынцыпы дэмакратычнасці і галоснасці

не толькі дэкларуюцца, але і ўжыццяўляюцца. А гэта магчыма адпаведна ў такой сама дзяржаве. Таму тэндэнцыі развіцця адукацыі ў цэлым можна разглядаць у сукупнасці з тэндэнцыямі развіцця грамадства. І толькі намаганнямі ўсіх бакоў можна будзе дасягнуць станоўчага выніку. Кожны мусіць зрабіць свой унёсак.

## БАЦЬКОЎСКІЯ КАМІТЭТЫ

Якой я хачу бачыць школу, дзе вучацца мае дзеці, што я магу зрабіць, каб школа стала такой? Вось пытанні, якія мусяць ставіць для сябе бацькі, калі аддаюць дзіця ў школу, на якія трэба знайсці адказы.

Сёння вялікая колькасць бацькоў мала цікавіцца жыццём школы, не давярае школе, не бачыць магчымасці паўплываць на працэсы, якія там адбываюцца. Часта і настаўнікі не зацікаўленыя супрацай з бацькамі, успрымаюць дачыненні з бацькамі толькі як нязначную частку сваіх абавязкаў.

Зразумела, што такая сітуацыя шкодная, не працуе ні на аднаго з суб’ектаў школьнага жыцця, таму надзвычай важна распачаць працэс актыўнага ўзаемадзеяння паміж бацькамі і школай у тых адукацыйных асяродках, дзе мы працуем і дзе навучаюцца нашыя дзеці.

Удзел бацькоў у жыцці школы ўжыццяўляецца праз бацькоўскія камітэты на роўні класаў і праз Раду школы на роўні ўсёй школы. Бацькоўскія камітэты фармуюцца на бацькоўскіх сходах класаў у колькасці 3-5 чалавек звычайна шляхам адкрытага галасавання. З абранага бацькоўскага камітэту адзін чалавек абіраецца ў Раду школы. Законам прадугледжана стварэнне агульнашкольнага і класных бацькоўскіх камітэтаў з мэтай дапамогі школе ў рэалізацыі яе статутных заданняў, забеспячэння адзінства педагагічных патрабаванняў да навучэнцаў і дапамогі ў выхаванні і адукацыі дзяцей.

Бацькоўскія камітэты могуць выносіць пастановы ў форме прапаноў. Пастановы афармляюцца пратаколам і захоўваюцца ў справах школы. Прапановы бацькоўскіх камітэтаў, прынятыя па іх пастановы, мусяць разглядацца ў абавязковым парадку прадстаўнікамі адміністрацыі школы з паведамленнем вынікаў гэтага разгляду старшыні адпаведнага камітэту.

На практыцы праца бацькоўскіх камітэтаў, а таксама Рады школы, зводзіцца да развязання фінансавых пытанняў, у прыватнасці арганізацыі так званага “бацькоўскага фонду”. Пытанне бясспрэчна важнае, зыходзячы з таго, што школа з дзяржаўнага бюджэту атрымлівае мінімум сродкаў, але не адзінае, якое патрэбна было б развязаць. Не трэба забываць, што школа – гэта адукацыйная ўстанова, дзе паўстае шмат пытанняў па арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу. На жаль, адміністрацыя ў шматлікіх сітуацыях не лічыць патрэбным раіцца з бацькамі, а бацькі самы не ведаюць, што ім рабіць, не ведаюць сваіх правоў і абавязкаў.

Артыкул 51 Закону "Аб адукацыі", у якім прапісаныя правы і абавязкі бацькоў, сканчаецца словамі "Законныя прадстаўнікі дзяцей нясуць адказнасць за выхаванне дзіцяці ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь". Вось так, каб не забыліся бацькі, што і на іх ляжыць такая адказнасць, як выхаванне іх дзяцей. А можа таму школа аніяк і не жадае дзяліцца з бацькамі сваімі функцыямі, бо лічыць сябе (дзе больш відавочна, дзе больш скрыта) галоўным выхавальнікам дзяцей. Пытанне найважнейшае, калі казаць пра супрацу школы і сям'і.

# Высновы

Сістэма кіравання ў беларускай школе застаецца аўтарытарнай і цэнтралізаванай, і патрабуе карэнных зменаў. Прынцып самакіравання не рэалізуецца напоўніцу, а дзейнасць органаў школьнага самакіравання неарганізаваная і неэфектыўная. Толькі пасля змены сістэмы кіравання ў сферы адукацыі, можна будзе распачаць сапраўдную рэформу, можна будзе казаць пра ўдзел у развязанні пытанняў адукацыі шырокага кола грамадзянскай супольнасці.

Калі ж прааналізаваць даныя заканадаўствам паўнамоцтвы органаў самакіравання, правы і абавязкі бацькоў, вучняў, настаўнікаў на роўні школы, то можна зрабіць выснову, што нягледзячы на ўсе недасканаласці заканадаўства, усё ж нешта можна пачынаць рабіць і цяпер. Для гэтага патрэбнае нашае жаданне, настойлівасць і прававая адукаванасць.

Брак прававой культуры дазваляе казаць пра функцыянальную непісьменнасць як суб'ектаў школьнага жыцця, так і грамадства ў цэлым.

Ёсць пільная патрэба ў шырэнні ведаў пра функцыянаванне школы як арганізацыі, дзейнасць якой базуецца на прынцыпах свабоды, дэмакратыі і самакіравання, ведаў пра правы і абавязкі бацькоў, звязаных з адукацыяй і выхаваннем іх дзяцей. Не менш важным ёсць і ўзмацненне ўплыву школьнага грамадства на працэсы, што адбываюцца ў школе, шыранне паўнамоцтваў органаў школьнага самакіравання.

# Дадатак

## Вытрымкі з Закону "Аб адукацыі" ад 2002 г.

### Артыкул 44. Кіраване ў сферы адукацыі

Кіраванне ў сферы адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь носіць дзяржаўна-грамадскі характар і ўжыццяўляецца на аснове прынцыпаў галоснасці і дэмакратыі.

Дзяржаўнае кіраванне ў сферы адукацыі ўжыццяўляе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Урад Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання , мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы ў адпаведнасці з паўнамоцтвамі, прадугледжанымі Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, існым Законам і іншымі актамі Рэспублікі Беларусь.

У ўстановах адукацыі ствараюцца органы самакіравання (рады, апякунчыя рады). Палажэнне аб органах самакіравання зацвярджае Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 46. Кіраванне ўстановай адукацыі**

Кіраванне дзяржаўнай установай адукацыі ўжыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам, статутам гэтай установы адукацыі і базуецца на спалучэнні прынцыпаў адзінаначальніцтва і самакіравання.

Кіраўніцтва дзяржаўнай установай адукацыі ўжыццяўляе кіраўнік, які прызначаецца заснавальнікам у парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

Кіраванне прыватнай установай адукацыі ўжыццяўляе непасрэдна яго заснавальнік ці па яго даручэнні апякунчая рада, якая фармуецца заснавальнікам.

**Літаратура:**

Закон “Аб адукацыі” Рэспублікі Беларусь ад 29 кастрычніка 1991 г.

Закон “Аб адукацыі” Рэспублікі Беларусь ад 19 сакавіка 2002 г.

Беларусь: сцэнары рэформаў. – Фонд імя Сцяпана Батуры. Варшава, 2003.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т.3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай / Ю. Бохан, В. Голубеў, У. Емельянчык і інш. – Мн., 2004.

**Вольга Ахрук** – настаўніца сярэдняй школы, жыве ў Гародні. Аўтарка шэрагу публікацый па праблемах адукацыі і выхавання, рэдактарка настаўніцкага бюлетэню “Вукар”.

Міхал Юзаф Кавэцкі

# Дэкалог дыялогу ў беларускай школе

Чым ёсць інстытут школы і ці магчымы ў ёй сапраўдны дыялог? Інстытут – гэта фармалізаваная структура, якая кіруецца пэўнымі законамі, правіламі, працэдурамі, структура, якая мае свой парадак і іерархію, свае заданні, планы і мэты. Ёсць шмат сведчанняў і доказаў таго, што інстытуты, пакліканыя для высокіх мэтаў, становяцца часам бюракратычнай машынай, у якой пануюць закасцянеласць, холад і фармалізм. Менавіта такой машынай можа стаць і школа. Паўстае пытанне: як найлепей зберагчы інстытут школы ад закасцянеласці, усемагутнага маналогу, які замяняе надзею ў роспач?

Найлепшым спосабам ёсць абуджэнне самастойнасці і грамадскай актыўнасці вучняў і бацькоў. Трэба развіваць вучнёўскія і бацькоўскія самакіраванні, бо менавіта яны – самакіраванні, якія дзеюць у школах, – маюць дух дыялогу, пашыраюць сферу свабоды, дазваляюць кожнаму сказаць сваё слова. Дыялог паміж настаўнікамі, вучнямі і бацькамі ператварае школу ў жывую супольнасць, інстытут, вольны ад абмежаванняў, якія іманентна існуюць у кожнай фармальнай структуры.

Можна падаць шмат негатыўных прыкладаў, якія сведчаць пра бачнасць дыялогу з маладымі людзьмі. Свет дарослых розніцца ад свету дзіцяці: у ім больш інтарэсу, двухзначнасці і прагматызму, значна менш прыгажосці, простасці і шчырасці, менш сэрца, менш свежасці і гатовасці вучыцца ад іншых. А таму, калі школа мае стаць інстытутам адкрытым, у ёй абавязкова мусіць дзеіць Вучнёўскае самакіраванне, надзеленае вялікай аўтаноміяй і шырокімі паўнамоцтвамі. Творцы асветных законапраектаў, якія думаюць пра далёкую перспектыву, мусяць ствараць юрыдычныя падставы для заахвочвання маладых людзей выяўляць сваё меркаванне і нязгоду на дзіцячыя паталогіі ў школе, юрыдычныя развязанні, якія гарантуюць супольны ўдзел у прыманні развязанняў, якія тычацца, прыкладам, праграмаў і метадаў навучання, спосабаў ацэньвання і арганізацыі заняткаў.

Дыялог з вучнямі (і бацькамі) належыць да найважнейшых і адначасна найцяжэйшых заданняў, якія стаяць перад настаўнікамі, дырэкцыямі школ і асветнымі ўладамі. На практыцы вельмі рэдка можна сустрэць Вучнёўскія самакіраванні з вялікай незалежнасцю і аўтаноміяй дзейнасці. Прычыны такой сітуацыі палягаюць у юрыдычных нормах, якія санкцыянуюць аўтакратычны стыль кіравання школай і дыстанцыйнае кіраванне асветай. Адной з важных прычын слабасці вучнёўскіх самакіраванняў ёсць недастатковы клопат пра іх з боку школьных Бацькоўскіх радаў і бацькоўскіх таварыстваў, якія дзеюць на лакальным, рэгіянальным, дзяржаўным і еўрапейскім роўнях.

Бацькі ёсць у вельмі падобнай сітуацыі, што і вучні, але іх розніць тое, што яны ў змозе заснаваць і развіваць таварыствы, з якімі асветным уладам будзе цяжка не лічыцца. Бацькі, плацячы падаткі, утрымоўваюць школы і ўвесь апарат

чыноўнікаў. Зразумела, што яны хочуць мець уплыў як на школы, так і на ўсю сістэму адукацыі.

Добрым прыкладам з гэтага гледзішча стала Заходнепаморскае Таварыства Бацькоў (ЗТБ), заснаванае колькі год таму ў Шчэціне. Прыярытэтам, сведама абраным творцамі ЗТБ, ёсць падтрымка вучнёўскіх самакіраванняў, а гэта і ўмацаванне школьнай дэмакратыі. Вынікам супрацы бацькоў і вучняў стала арганізацыя першай Шчэцінскай канферэнцыі Вучнёўскіх самакіраванняў – Шчэцін 2004 і дапамога ў стварэнні незалежнага выдання "Вучнёўскае самакіраванне", якое рэдагуецца самымі вучнямі.

Актыўны ўдзел бацькоў у жыцці школы, іх уплыў на форму ўсёй адукацыйнай сістэмы дае надзею на сталую прысутнасць чалавечага вымярэння – людзкасці – у інстытуце школы. У ўсіх творчых дзеяннях бацькоў іх асноўнай матывацыяй заўсёды будзе некарыслівая любоў да дзіцяці. Сваім парадкам настаўнікі ў шчырых памкненнях таксама маюць на мэце дабро вучняў, дабро дзяцей. Любоў бацькоў і клопат настаўнікаў разам ствараюць салідны падмурак для плённага і прыязнага дыялогу трох роўнапраўных партнёраў адукацыі. Нішто так не акрыляе маладога чалавека, нішто так не ўздымае духу вучня і нішто так не стварае ў ім пазітыўнай матывацыі да працы і намаганняў, як поўная шанавання і прыязнасці пастава з боку дарослых. Шмат непатрэбнага зла, несправядлівасці і гвалту нараджаецца па віне дарослых: іх непрадуманых паводзінаў, выбухаў некантраляванай злосці, непрымання ўяўленняў дзяцінства, навязвання і таптання годнасці дзіцяці. Адказам на такія паводзіны настаўнікаў, выхаваўцаў і бацькоў ёсць глухі бунт, прага помсты, дзеянне насуперак, страта жадання працаваць, а часцяком і руйнаванне веры ў сэнс жыцця.

Адукацыя, якая традыцыйна ўспрымаецца як працэс навучання і выхавання, нясе з сабой небяспеку санкцыянавання гвалту. Гэтую небяспеку ўсведамляў яшчэ Сакрат: каб дайсці да ўсведамлення свайго няведання (знакамітае "я ведаю, што я нічога не ведаю") трэба памятаць, што "найлепей не прыгнятаць іншых, але працаваць над сабой, каб быць як мага найлепшым".

Тыя, хто навучае і хто выхоўвае, падпадаюць – я паўтаруся – пад небяспеку ўжывання санкцыяванага гвалту. Замацаванне, праверка, кантроль і ацэньванне ведаў, а таксама ўзнагароджванне і пакаранне вучняў ствараюць поле для неабмежаваных, але цяжкіх для выхоплівання злоўжыванняў з боку педагогаў, злоўжыванняў, дадам, часцей за ўсё нясведамых. Трэба сапраўднай духоўнай моцы, каб настаўніку трымацца перад шматлікімі спакусамі, а хто хацеў бы пакласціся ў гэтай матэрыі толькі на самога сябе і трактаваць вучня як каштоўнага саюзніка – той быў бы апошнім дурнем.

Дыялог, які яднае партнёраў школьнай (і хатняй) адукацыі, сягае сваімі пачаткамі і каранямі ў нутраны дыялог, які характарызуе людзей адкрытых і непакорных, людзей самакрытычных і адважных, поўных пасіі і прысвячэння. Сваю незалежнасць і якасць адукацыя набывае дзякуючы тым, хто вырастае па-над інстытутам школы, хто самы па сабе ёсць інстытутам. Гэта тыя, хто

вучыцца ад маладых цярплівасці і пакоры, цікаўнасці і памяркоўнасці, любові і аптымізму. Гэта тыя, хто могуць пажартаваць і пасмяяцца з самых сябе, гэта таксама і тыя, хто можа публічна прызнаць памылку і ведаюць, як яе выправіць. Карацей кажучы, гэта людзі-інстытуты. Яны ствараюць аднаасабовыя Акадэміі дыялогу і адразу становяцца іх рэктарамі, атрымоўваючы ад гэтага максімум радасці і задавальнення і не маючы пры гэтым ніякіх фінансавых выдаткаў. Духоўная моц – гэта вынік унутранага дыялогу, вынікам змаганняў і працы, страсці і болю, запалу і пакутаў. Гэты дыялог бярэ сваю моц з промню любові, "які разгараецца недзе там, у глыбіні нашага жыцця". Арыгенас пісаў, што наша здольнасць да арыентацыі сярод рэчаў і людзей, наша самасведамасць (...), ёсць вынікам "ахаладжэння першаснага агню любові". Паводле яго веды – гэта "ахалоджаная любоў".

Першым словам кожнага дэкалогу, словам-учынкам ёсць любоў. Менавіта яна сваім полымем ажыўляе ўсю прыгажосць, якую мае ў сабе кожны чалавек. Кожны наступны запіс дэкалогу мае сваю крыніцу ў адвечнай любові.

Гэта можна прасачыць на прыкладзе семінарскай працы настаўнікаў з Беларусі, якія мусілі б стварыць дэкалог дыялогу ў беларускай школе.

## ДЭКАЛОГ ДЫЯЛОГУ Ў БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЕ:

1. Бацькі, настаўнікі і дзеці маюць тую сама крыніцу любові.
2. Для Дабра ўсе роўныя.
3. Даючы іншым любоў і веды, сам становішся багацейшы і мудрэйшы досведам іншых людзей.
4. Сэрца настаўніка адкрытае на ўсіх вучняў і бацькоў, бо ў кожным ёсць штосці вартае любові.
5. Кожная думка, кожны рух пачуццяў вартыя ўвагі і зразумення.
6. У кожным чалавеку, калі захочаш, можна знайсці прыгажосць непаўторнасці.
7. Стаўся да іншых так, як хочаш, каб ставіліся да Цябе.
8. Дай сабе хоць крышку пачуцця гумару! Занадта сур'ёзныя заняткі нудзяць і адштурхваюць.
9. Размаўляючы з дзецьмі і бацькамі, ніколі не парушай іх прыватнай і інтымнай сферы. Заўсёды шануй іх ГОДНАСЦЬ.
10. Школа – гэта другі дом, над якім заўсёды свеціць Сонца Ласкі.

**Міхал Юзаф Кавэцкі** – псіхолаг і тэрапеўт, лідар незалежнага Адукацыйнага цэнтру ў Шчэціне, сябра ўправы Еўрапейскага Таварыства Бацькоў [EPA - European Parents Association] з сядзібай у Брусэлі, удзельнік шэрагу агульнадзяржаўных і міжнародных кангрэсаў у галіне адукацыі, аўтар больш за 60 публікацый.

*Пераклад з польскай мовы Наталлі Маліноўскай*

Габрыеля Вятр

# ШКОЛА ЯК ЛЮСТЭРКА

Хто такі грамадзянін? Той, хто нарадзіўся ў пэўным месцы на зямлі, што вызначае яго дзяржаўную прыналежнасць. Ён мусіць падпарадкоўвацца правілам, якімі кіруецца гэтая дзяржава, але таксама атрымоўваць з грамадзянства (прынамсі мусіць атрымоўваць) пэўную карысць. Нехта ёсць грамадзянінам на моцы "сілы безуладнасці", ён не ўкладае ў сваё грамадзянства аніякага намагання. Іншы лічыць сябе грамадзянінам з пачуцця салідарнасці з народам, з прагнення зрабіць нешта для сваёй дзяржавы і жадання ўплываць на яе лёс. Гэта найбольш відавочна на лакальным роўні, бо грамадская актыўнасць бярэ свой пачатак у малых справах, з невялікім, зусім не агульнадзяржаўным абсягам.

Хочацца верыць, што польскае грамадства ўсё бліжэй да грамадзянскай супольнасці. Шмат што кажа пра тое, хоць канешне, мы надалей робім памылкі, надалей шмат у нас пасіўнасці і нежадання ўлучацца ў агульныя справы. Асабліва, калі на штодня трэба дбаць пра асабістыя інтарэсы, паляпшаць найперш сваё жыццё, а з перспектывы двара агульныя праблемы здаюцца менш важнымі.

Што ўсё гэта мае агульнага з школай? Вельмі шмат. Бо ў школе, як у люстэрку, адлюстроўваецца стан і якасць грамадства.

## Учора

Польская школа 15-20 гадоў таму прынцыпова рознілася ад сённяшняй. Я памятаю яе з перспектывы вучня. Апранутая ў капронавы буры фартушок, як усе мае аднагодкі, я успрымала школу як установу, дзе з вучнем надта не лічацца. Там не было месца нашым вынаходніцтвам, а актыўнасць вызначалася сцісла акрэсленымі межамі абавязкаў і правоў вучня. Аніякіх інавацый. Аніякіх ідэяў. Я памятаю афіцыйныя вечарыны, урачыстасці з розных нагодаў, конкурсы выразнага чытання, паланістычныя, расейскай мовы... Добры вучань – гэта вучань ціхі, выхаваны і пакорлівы.

Тое сама і бацькі. Заданне бацькоў палягала ў аплаце ўнёскаў на так званы бацькоўскі камітэт, закупе згаданага фартушка і ўсяго патрэбнага для школы, а таксама ў рэгулярнай прысутнасці на бацькоўскіх сходах. Бацькі сядалі за парты, на месцы сваіх дзяцей і ўважліва слухалі прысуды настаўніка. Аніякіх ідэяў. Аніякай дыскусіі.

Трэба, аднак, шчыра прызнаць, што шмат залежала ад настаўніка. Былі такія, якім бацькі баяліся выказаць свой супраціў, каб наступствы за іх

непакорлівасць не плацілі дзеці. Можна ж было лёгка адпомсціць, ставячы несправядлівую двойку, а потым наступную і наступную. Але былі таксама настаўнікі, поўныя цяпла і зычлівасці, якія любілі моладзь, а сваю працу ўспрымалі як пакліканне. Часцей усяго яны супраціўляліся сістэме, якая тады панавала, застаючыся ў стане ціхага паразумення з бацькамі і балансуючы паміж сваімі меркаваннямі і змушанасцю адпавядаць афіцыйным патрабаванням. Такіх настаўнікаў натуральна шанавалі вучні і бацькі, яны маглі больш зрабіць дзякуючы свайму аўтарытэту, а не зверху навязаным нормам. Я памятаю асабліва тых, якія не баяліся падчас заняткаў казаць пра сапраўдную, а не сфальшаваную цэнзураванымі падручнікамі гісторыю, якія не прамаўлялі мовай тагачаснай прапаганды, але мелі адвагу прышчапіць моладзі прагу свабоды і дэмакратыі.

## Сёння

Зараз сітуацыя дыяметральна супрацьлеглая. Бацькам ужо даўно створаны юрыдычныя магчымасці ўплыву на школьную рэчаіснасць. Навучанне ўзаемнай супрацы настаўнікаў і бацькоў, а таксама дырэктараў і бацькоў (а гэта не тое сама) надалей адбываецца. Усё яшчэ даволі часта здараецца, што бацькі не хочуць марнаваць час на школьныя справы, перакананыя, што гэта абавязак толькі настаўнікаў. З іншага боку, шматлікім настаўнікам не падабаецца, калі бацькі ўмешваюцца ў школьную практыку. Пры гэтым яны засланяюцца шматгадовым досведам і педагагічнай адукацыяй. Але ж бацькоўскую любоў і інтуіцыю нельга замяніць вопытам настаўніка, хай нават сама вялікім.Таму так важна, каб бацькі і настаўнікі былі саюзнікамі ў справе навучання і выхавання маладога пакалення.

* * *

Апошнія гады ў шчэцінскай адукацыі паказалі, што такі саюз магчымы. Кажуць, што адной з рысаў, якая характарызуе палякаў, ёсць уменне мабілізавацца ў момант небяспекі. Штосці ў гэтым ёсць, калі прыглядзецца да сама новых праблемаў школаў у Шчэціне (зрэшты, яны агульныя для школаў усёй краіны).

Польская асвета сутыкнулася з нізкім дэмаграфічным прыростам, у такім маштабе з’явай яшчэ новай, якая выклікае пэўную дэзарыентацыю. Разам з пастаяннымі матэрыяльнымі праблемамі адсутнасць дзяцей (а ў Польшчы колькасць грошай, якую атрымоўвае школа ад мясцовага самакіравання, залежыць ад колькасці дзяцей!) становіцца сапраўднай катастрофай. Цягам гадоў мы марылі пра меншую колькасць дзяцей у класах, у якіх лягчэй было б рэалізоўваць дыдактычны працэс і наладжваць індывідуальны кантакт з вучнем. А калі сталася, што мара гэтая вельмі наблізілася да рэалізацыі, эканамічныя рэаліі кажуць самакіраваннем ліквідаваць школы. Такія рашэнні

не сустрэлі грамадскай акцэптацыі. Гэта быў момант актывізацыі бацькоў, якія аб'ядналі свае сілы з настаўнікамі ў абароне школ. Раптам усе заўважылі, што адукацыйныя пляцоўкі – гэта не толькі месца працы настаўнікаў, навучання і выхавання дзяцей, але і асяродак канцэнтрацыі сілаў лакальнай супольнасці, носьбіт традыцыі і культуры. Паўсталі пратэстныя камітэты. А чыноўнікі і мясцовыя СМІ засыпаліся дзесяткамі петыцый, пратэстаў, просьбаў і пастулатаў. У іх даказвалася, што школы патрэбныя для канкрэтнага асяроддзя, пералічваліся дыдактычныя і выхаваўчыя поспехі. Падкрэсліваліся заслугі працы з дзецьмі-інвалідамі, якія, дзякуючы навучанню, інтэграваліся з здаровымі аднагодкамі. Падкідваліся ідэі, як і на чым можна эканоміць пры захаванні школы. Гмінныя ўлады адчулі вялікі націск. І хоць нельга было адмовіць слушнасці аргументаў за закрыццё часткі школаў і дзіцячых садкоў, на вызначальнай сесіі Рады горада Шчэціна большасць пастаноў пра закрыццё школаў не прайшла. Зрэшты, удзел у гэтай сесіі ўзялі таксама і бацькі, некаторыя з іх прывялі дзяцей, у тым ліку інвалідаў. Можна канешне іх папракнуць за ўмешванне дзяцей у дарослыя разборкі, але нельга не прызнаць грамадзянскай адвагі гэтых людзей. Урэшце ў 2004 годзе было прынятае рашэнне пра ліквідацыю двух дзіцячых садкоў, стандарты якіх не адпавядалі патрабаванням. Ліквідацыі яшчэ аднаго дзіцячага садка не дапускаў куратар асветы (які таксама быў "тарчай" бацькоўскіх заўвагаў). Самакіраванне падало рашэнне куратара да Міністэрства Народнай Адукацыі і Спорту, але і яно прызнала яго правамоцнасць.

Як выглядае супраца з бацькамі ў штодзённых, не такіх паказальных, сітуацыях? Па-рознаму. Школы маюць прэтэнзіі да бацькоў за пасіўнасць, бацькі маюць прэтэнзіі да школаў за нежаданне ўспрымаць наватарскія ідэі і патрабуюць рэальнай, а не толькі фармальнай супрацы.

Але ёсць усё больш прыкладаў добрай практыкі. Сямейныя святы, на якія мамы пякуць пірагі і рыхтуюць фанты на латарэі і кірмашы, удзел ў дабрачынных акцыях (пры нагодзе дзеці прызвычайваюцца адчуваць патрэбы іншага чалавека), дапамога ў рамонце, аварыі, знаходжанне таннейшых выканаўцаў розных паслуг. Бацькі дамагаюцца ад уладаў развязання сваіх праблемаў там, дзе дырэктары школ не даюць рады (як у сітуацыі абмежаванняў колькасці вучняў для прымання ў школы, а ў выніку, занадта вялікіх класаў). Настаўнікі імкнуцца ствараць бацькам магчымасці падвышэння сваіх выхаваўчых "кваліфікацый". У сярэдняй школе № 64 у Шчэціне арганізаваны псіхалагічныя практычныя заняткі і індывідуальныя кансультацыі для бацькоў, у СШ № 61 адбываюцца сустрэчы ў межах курсу "Бацькоўская акадэмія".

Дайшло да таго, што падчас нарадаў заходнепаморскага куратара асветы з дырэктарамі школ перад пачаткам навучальнага 2004-2005 году, куратар Ежы Катленга намаўляў дырэктараў да супрацы іх школ з бацькамі. Яны мусілі быць партнёрамі настаўнікаў, бо ў іх ёсць велізарны патэнцыял, незалежна ад адукацыі і сацыяльнага роўню. У кастрычніку 2004 году мы мелі прыклад

такога патэнцыялу. Гарадскія ўлады прынялі пастанову пра далучэнне да мерапрыемства Польскай Гуманітарнай Акцыі, якая хоча пабудаваць цэнтр рэабілітацыі і псіхалагічнай дапамогі ахвярам тэрарыстычнага акту ў школе Бяслану ў Паўночнай Асетыі. Пад лозунгам “Дзеці Шчэціна для дзяцей у Бяслане!” дзіцячыя садкі і школы ўсіх відаў спаборнічалі ў розных ідэях, як зберці грошы. Сутнасць акцыі палягала не ў колькасці сабраных грошай, але ў самым жэсце салідарнасці з людзьмі, якія перажылі трагедыю. Кульмінацыяй гэтых дзеянняў стаў велізарны фэст у цэнтры гораду, у адным з сама маляўнічых гарадскіх паркаў. Пры ўдзеле 45-ці школ, Заходнепаморскага таварыста бацькоў і, зразумела, бацькоў, не аб’яднаных у гэтай арганізацыі, удалося зберці каля 18 тысяч злотых.

У нашых дамах і школах ідзе гульня з вялікай стаўкай – будучыняй. Гульня за тое, якім будзе грамадства, у якім чалавек чалавеку будзе братам або ваўком. Варта ў гэтай гульні мець як мага болей саюзнікаў.

**Габрыеля Вятр** – па адукацыі сацыёлаг, працуе журналісткай у штодзённай газеце “Шчэцінскі кур’ер”, спецыялізуецца на школьнай і сацыяльнай тэматыцы. Узнагароджана за публікацыю, якая ўздымае праблемы людзей з вірусам HIV. Замужам, мае трое дзяцей.

*Пераклад з польскай мовы Наталлі Маліноўскай*

Лявон Карповіч

# ЗНАЙСЦІ ПУНКТ АДЛІКУ

*“Прыналежнасць да народу – гэта справа не толькі цела і крыві, але справа маральнага пераканання так вялікая, што за яе мы гатовыя заплаціць жыццём.”*
*(Вінцэнт Лютаслаўскі).*

Часта перад намі паўстае амаль гамлетаўскае пытанне “Рабіць ці не рабіць?”. Ні ў якім разе не трэба блытаць яго з пытаннем “Працаваць ці не працаваць?” Бо можна працаваць, але нічога не рабіць. І гэта яшчэ не сама горш. Іншая работа настолькі шкодная, што грамадству лепей плаціць такому “работніку”, каб ён нічога не рабіў.

Ніколі нельга нікога моцна пераспрэчваць, за выняткам, гульні. Гэта для многіх даволі цяжка. Але трэба ўсведаміць: калі пераспрэчваеш, робіш насілле, гвалт не фізічны, але духоўны. Будзеш мець супраціў і хвілінны выйгрыш не спраўдзіцца ў часе. Акрамя ўсяго, той, хто прыгнечаны ў спрэчцы, адчувае сябе нешта страціўшым, пераможаным, пакрыўджаным, захоча рэваншавацца. У спрэчцы, на мой пагляд, трэба толькі выявіць наяўнасць і магчымасць выбару, спарадзіць у апанента сумнеў. Калі няма агульных прынцыпаў, няма дыялогу. Каб весці дыялог, трэба знайсці пункт адліку – на чым пагаджаемся, ад чаго адштурхоўваемся.

Народы створаны Богам. “Усё ад Бога, а без Бога нічога не з’явілася”, – чытаем у Евангеллі Святога Яна. Значыць Бог так хацеў, жадаў ад вякоў у сваіх планах, таму ў сям’і народаў еўрапейскіх ёсць народ Беларускі. Народ народжаны ў адвечнай здуме Божай, то і кожны чалавек невыпадкова прыналежыць да таго ці іншага народу. Ці гэта значыць, што кожны, хто нараджаецца ў Беларусі, Польшчы, Францыі, Расеі, з’яўляецца на свет Беларусам, Палякам, Французам ці Расейцам? Хіба не. Але чалавек, які з’явіўся на свет, не ёсць абстрактны, ён дзіця канкрэтных бацькоў, грамадзянін канкрэтнай дзяржавы, прыналежыць да канкрэтнага народу, цесна зніталаваны з канкрэтнай зямлёй, яе гісторыяй, культурай і г.д. Таму натуральна паўстае пытанне – ці не мае тады кожны чалавек нейкае заданне Божае, якое мусіць здзейсніць, якое ёсць яго жыццёвай місіяй? Ці не ёсць абавязкам чалавека бараніць дары Бога: Радзіму, Мову, народныя звычаі? Ці не за выкананне гэтага абавязку, сярод іншых, будзе спытана у Вечнасці з кожнага? Лагічны ланцуг замыкаецца тым, што ў гісторыі няма разрываў і пустак. Таму народ, які не выканаў сваіх абавязкаў у сваіх справах і дзеях, замяняецца іншым, тым, які сваю місію выканае.

Усе людскія групы, якія лічаць сябе народам, маюць агульнае толькі адно: яны САМЫ вызначаюць сябе як НАРОД. Інакш кажучы, народ ёсць там, дзе

ёсць народная ідэя ці народная сведамасць. Але сведамасць заўсёды ля сваіх вытокаў элітарная. Многа часу патрэбна і выкананне многіх ўмоў, каб адбыўся працэс усведамлення людзей народам.

Адвечнае пытанне ў краінах пад чужой уладай: "Чаму народ не паўстае?". Таму, што змаганне, якое вядуць патрыёты, не стала змаганнем людзей у масе. Перайманне ідэі народнай салідарнасці праз менш адукаваную масу насельніцтва, якое мае толькі сведамасць рэгіянальнай прыналежнасці, – гэта доўгатэрміновы і мазольны працэс.

Народ – гэта сувязь тых, што жывуць, з тымі, якія памёрлі, і з тымі, якія народзяцца. Спадчына, на якой народ будуе сваё цяперашняе і будучае, не ёсць найчасцей такой, якой яе ўсведамляюць прадстаўнікі народу, ці такой, як вучаць у школе. Гэта зусім розныя рэчы, як было насамрэч і што прымаем на веру. Сутнасць жа грамадзянскай адукацыі – абмяркоўваць усе пытанні, але пры гэтым не прымаць чый-кольвек бок. Не кажам, якога пункту гледжання трымацца, але даем сродкі, якія дапамагаюць фармаваць асабісты погляд па розных пытаннях і прымаць самастойныя развязанні. Паказваем, як ужыццяўляецца дэмакратычны працэс і які ўнёсак можна ў яго зрабіць. Мне падаецца, што гэта найбольш прыймальная пазіцыя для многіх настаўнікаў у ўмовах дыктатуры, калі адкрытая патрыятычная пастава вядзе да пераследу і звальненняў.

У той жа час трэба ясна ўсведаміць, што без факту, што хтосці скажа: *"Мы ёсць народ!"*, народу няма. Хтосці гэта мусіць сказаць, а людзі мусяць у гэта паверыць. Згодна з метафарай прафесара Ежы Шацкага, "народ – гэта спячая каралева, якую нацыяналізм будзіць да жыцця". Маецца на ўвазе не магічны пацалунак, а складаны працэс прасочвання сведамасці народу ў грамадства. Нацыяналізм гэты працэс праводзіць праз многія рэчы, хоць бы праз гісторыю.

Тое, што народ можа знікнуць, а значыць ёсць нечым гістарычным і часовым, не значыць, што ёсць неважны, што без яго можна абысціся, замяніць іншым. Бо знікне частка агульначалавечай культуры. Можна спытаць, пра якую культуру ідзе гаворка, калі ўсюды пануе поп-культура. Хто цяпер чытае "Новую зямлю" Якуба Коласа, хто ведае вершы Максіма Багдановіча, не кажучы пра творы Яна Чачота ці Францішка Багушэвіча?! І ў такім рытарычным пытанні ёсць многа прыкрай праўды. Таму такую каласальную ролю для нас адыгрывае мова. Мова ў вельмі шырокім разуменні, ахопліваючым ўсё тое, што дазваляе даходзіць да паразумення ўсім асобам супольнасці. Нават такое паразуменне, якое не паддаецца апісанню.

Жыве пачуццё, што існавала Вялікае Княства, што ёсць Полацк, Навагародак, Вільня, што дзяржаўнымі сімваламі былі Бел-чырвона-белы Сцяг і Герб "Пагоня", што ўсё гэта адчуваецца як сваё, хоць можа, многімі пакуль і нелюбае. І, нават для тых, якія не чыталі вялікай літаратуры, але чулі, што штосці значнае ёсць. І гэта штосці прыводзіць тысячы гледачоў на "Анастасію Слуцкую", што не адбудзецца ў сэнсе пачуццяў, калі гэты фільм будзе дэманстравацца ў іншай краіне.

На Беларусі, якой пачатак і канец там, дзе пачынаецца і сканчаецца Беларуская зямля, ёсць яшчэ Беларусь маральная, якая існуе там, дзе ёсць беларускі дух, і заканчваецца там, дзе яго няма. Каб беларускі дух панаваў на ўсёй Беларускай зямлі і нават за яе цяперашнямі межамі, напрошваецца ідэя народнай адукацыі. Народнай не толькі па змесце, але як справа ўсяго народа. На першым этапе гэта справа бацькоў і настаўнікаў. Найперш бацькоў. Але, каб так стала, першымі мусяць спрацаваць настаўнікі.

Неяк на "беларускай тэлевізіі" (такой яе назваць можна толькі ўмоўна, па месцы размяшчэння і трансляцыі, але не па змесце і місіі) адбылася перадача "Выбар" з пытаннем "Ці ёсць настаўнік ствараннікам гісторыі?" Цягам усёй перадачы нешта гаварылі пра дасягненні і цуды беларускай школы. Праз пяць хвілін пасля праграмы нельга было ўспомніць змест рэчаў, настолькі ўсё гаварылася пустое. Але, калі звярнуцца па сутнасці да рытарычнага пытання, то можна сцвярджальна адказаць: Так ёсць! Можа не наўпрост, але праз сваю місію, праз сваіх вучняў ёсць. То сумленны настаўнік мусіць ірваць на сабе валасы і пасыпаць галаву попелам, бо гэта значыць, што ўсе жахі самага крывавага XX стагоддзя – гэта справа і "яго рук". Адсюль выснова пра вялізную адказнасць настаўніка перад народам за сваю працу. Найважнейшым цяпер ёсць тое, каб як мага больш настаўнікаў гэта ўсведамілі.

Наступнае, што трэба зразумець, гэта падзел адказнасці і цяжару з бацькамі. Бацькоў трэба паставіць на першае месца. Бо бацькі – уладаннікі саду, дзе кветкі – дзеці. Настаўнік – садоўнік, на цэлае жыццё прызначаны праз Бога, народ і бацькоў. Гэтага прызначэння не дазволена яму пазбыцца, ці ў сабе яго нішчыць.

Для таго, каб Беларусь годна заняла сваё месца ў сям'і еўрапейскіх краін, трэба прайсці мазольны доўгатэрміновы працэс. Але ён не будзе мець поспеху, калі не адбудуцца змены ў адукацыі. Два кірункі гэтых зменаў ужо названыя: адукацыя мусіць быць грамадзянскай і народнай.

Як для мяне ні парадаксальна, нават ад сяброў ці людзей блізкіх па поглядах, часта чую: школа ў нас харошая, дае добрыя веды, настаўнік вельмі многа можа дасканаліць у навучальным працэсе. Якія падаюцца таму доказы?

*Доказ першы* (смешны). Большасць выпускнікоў школ паступаюць у ВНУ. Але кожная школа цвердзіць, што большасць яе выпускнікоў паступаюць у ВНУ. Конкурс зазвычай 4-6 чалавек на месца. З якіх жа школ выходзяць тыя, хто не праходзіць па конкурсе? Ці галоўная мэта школы – рыхтаваць вучня да паступлення? Для некаторых бацькоў і школ хіба так. Але для краіны? І чаму з сама "крутых" школ дзецям наймаюць рэпетытараў? Нават гэтае сціслае заданне і прэстыжныя школы самастойна выканаць не могуць.

*Доказ другі* (сумны). Нашы вучні займаюць першыя месцы на міжнародных алімпіядах. Так. Адбіраюцца здольныя (сумна, бо гэта мізэр) і іх рыхтуюць спецыялісты. Пры чым тут школа?

*Доказ трэці* (безвыніковы). Нашы вучні ў параўнанні з замежнымі ведаюць і умеюць намнога больш.

Сапраўды ведаюць намнога больш мноства непатрэбных рэчаў. Але, прыйшоўшы на працу, нічога не ўмеюць рабіць. Таму і маем такую якасць айчыннай прадукцыі. Мне кажуць: нашыя трактары (тэлевізары, халадзільнікі, Белазы...) купляюць у n-краінах свету. Так, купляюць. Так як у нас масава купляюць “чарніла” (ці, як яшчэ кажуць,“чары Ніла”) і самагонку. Хоць дрэнная якасць, але танна.

*Доказ чацвёрты* (самападманны). Нашы школы дасканала абсталяваныя, забяспечаныя ўсім неабходным, светлыя, чыстыя, бяспечныя. Настаўніку ніхто не забараняе распрацоўваць свае праграмы, вучыць паводле найноўшых тэхналогіяў... Дакладна так у нас распавядаюць пра калгасы (цяпер яны носяць, як і школы, розныя назвы: ЗАТ, УАТ...) “Сноў”, імя Дзяншчыкова, “Прагрэс”... Такіх калгасаў на ўсю краіну і двух дзесяткаў не набярэцца. Чаму не распавядаюць ні пра адзін калгас нашага раёну, ці суседняга? Так і з школамі: адна, дзве, ад сілы тры на раён. Узорныя. Туды і ідуць усе сродкі. А астатнія? Як Бог дасць. І ці можа настаўнік пракарміць сям’ю на сваю зарплату? Не. Таму ён змушаны шукаць дадатковыя крыніцы даходу. І яму няма калі, а ў большасці школ і няма магчымасці з-за тэхнічнай адсталасці, працаваць па-новаму, нават калі ён мае адпаведныя веды і здольнасці.

Ёсць яшчэ вельмі важныя пытанні. Магчыма больш важкія, на якія амаль зусім не звяртаецца ўвага. Па-першае, гэта здароўе дзяцей. Каб сказаць вельмі коратка, скірую ўвагу толькі на адно пытанне. Няма ніякай навуковай абгрунтаванасці дазавання хатняга задання. Паўсюдна назіраецца перадазоўка. Не ўлічваецца дапушчальная нагрузка на вочы ў дзіцячым веку. Як вынік медыкі канстатуюць значны рост захворвання вачэй у дзяцей. Але гэта тэма для асобнай доўгай размовы. Бо з году ў год пагаршаецца фізічны стан выпускнікоў у цэлым, а не толькі іх зрок. Па-другое, нават ў сама сучасных распрацоўках амаль не ўлічваюцца, а калі ўлічваюцца, то на інтуітыўным роўні, асаблівасці і законы дзейнасці мозгу. Аўтары нашых падручнікаў наагул неадукаваныя ў гэтых пытаннях. Якасць бальшыні школьных падручнікаў у лепшым разе застаецца на роўні сярэдзіны мінулага стагоддзя. Як настаўнік матэматыкі з трыццацігадовым стажам працы, магу сцвярджаць, што падручнікі матэматыкі з кожным новым выданнем становяцца горшымі. А выбару, альтэрнатывы няма. Мяркую, што гэтыя прыклады даюць аснову засумнявацца ў рэкламуемай высокай якасці адукацыі на Беларусі.

Сёння вельмі часта гучаць выказванні, што трэба “служыць Айчыне”, “працаваць для Айчыны”, “быць сапраўдным сынам Айчыны”... Адказныя чыноўнікі можа і мусяць ужываць такія словы. Для мяне ў іх замнога пафасу і замала жыцця. Мяне цікавіць, якім чынам выяўляецца любоў да Айчыны ў інжынера, дворніка, калгасніка, прадпрымальніка, настаўніка або лекара?

Большасць людзей маюць сем’і, дзяцей, сяброў, знаёмых... Як выхоўваюць сваіх дзяцей? Чым кіруюцца ў сваіх учынках? Бо Айчына, тая, што на штодзень, не на святы і ўрачыстасці, ёсць такая, якія ёсць людзі. У іх штодзённых дзеях, у іх паставе таксама выяўляецца любоў да Айчыны. А яшчэ

– у іх культуры, спосабе быцця, у стасунках да іншых людзей...У здольнасці і адвазе вырашаць сумленна надзённыя пытанні ў розных сітуацыях. І паўстае пытанне, ці можна навучыць любіць Айчыну? Думаю, што так. Але навучыць гэтаму можа толькі той, хто сам мае такую любоў. Тады знойдуцца і адпаведныя словы:

З волі ўсемагутнага Бога ёсць Беларусам.
Беларус ёсць змагар за праўду і справядлівасць.
Вышэйшая норма дзейнасці Беларуса – Божае права і карысць Беларусі.
Найвышэйшай каштоўнасцю Беларуса ёсць Бацькаўшчына і яе дабрабыт.

Так, як знайшоў адпаведныя словы паэт Сяргей Законнікаў:

Слабыя душы гвалт падмяў,
Купіў за грэшныя спакусы,
Але наш абярог - імя,
Жывое слова: “ БЕЛАРУСЫ”.
Прыйшоў і не адступіць час
Прад Богам за яго адказваць,
Каб потым на Зямлі ад нас
Не засталася толькі назва...

**Лявон Карповіч** – настаўнік сярэдняй школы, публіцыст, краязнавец, жыве ў мястэчку Луна Мастоўскага раёну. Ёсць сябрам Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі Беларускага Народнага Фронту, сябрам грамадскага аб’яднання “Фонд імя Льва Сапегі”.

# Справа сапраўды агульная
(размовы Габрыелі Вятр пра адукацыю)

## Пра нетыповыя натхненні

Размова з айцом **Маркам Косачам**, дамініканінам з Шчэціна, трэнерам і настаўнікам рэлігіі.

*Што трэба зрабіць, каб бацькі і настаўнікі не апынуліся на процілеглых баках барыкады?*

Ёсць такі стэрэатып, калі бацькі прыходзяць на сустрэчу з настаўнікам, сядаюць за парты вучняў, настаўнік стаіць за сваім сталом або каля дошкі і... паўтараюцца ролі, якія былі яшчэ шмат гадоў таму. Настаўнік прамаўляе – бацькі слухаюць. Часам яны нярвовыя, часам спакойныя, часам слухаюць і патакаюць, але часцей ведаюць усё лепш за настаўніка. А рэч палягае ў тым, каб сесці разам і падумаць: “Шаноўнае Спадарства, гэта нашы дзеці. Давайце зробім нешта разам!”. Настаўнікі, бацькі, давайце запросім таксама моладзь і дзяцей і падзелімся нашым досведам. Давайце прадумаем план, што мы будзем рабіць цягам, прыкладам, бягучага году. Мне здаецца, што гэта варта запісаць. Запісванне, маляванне або стварэнне чагосці канкрэтнага на паперы дапамагае ўяўляць, зрэшты, ёсць пэўным пунктам адліку. Нельга проста дамовіцца, што мы нешта робім, бо потым гэта можа дзесці ў памяці страціцца.

*Якія ёсць “тэхнічныя” метады для актывізацыі бацькоў?*

Першы: выкарыстаць сама простую рэч – танец. Выкарыстаць танец інтэграцыйны або народны. Можа гэта шакуе, але ў танцы людзі ўсміхаюцца, звяртаюць увагу на нешта іншае, чым звычайна. На чалавечую псіхіку ўплывае рух цела, мелодыя.

*Гэта не толькі можа, але сапраўды шакуе. Танец жа не змяшчаецца ў сур’ёзную бацькоўскую ролю!*

І так адбываецца на семінарах, якія я праводжу. Удзельнікі прыходзяць з кавай, гарбатай, нататкамі, сядаюць за столікі. А я кажу: “Шаноўнае Спадарства, крэслы і сталы – да сцяны, бо мы будзем танцаваць”. Татальнае здзіўленне. А ўжо як мы патанцуем, то становіцца сапраўды інакш. Я ахвотна карыстаюся памножанымі карцінкамі. Напрыклад, раздаю ўсім “мадэль сотавага тэлефона” – звычайную ксеракопію, на якой выява мабільніка з пустым экранам. Давайце ўявім сабе, што нехта мае праблему і просіць сябра, каб даслаў яму SMS, калі прыдумае развязанне. А таму я даю такі “сотавы” кожнаму з бацькоў і кажу: “Шаноўнае Спадарства, Вашы дзеці ўцякаюць з школы. Напішыце мне, калі ласка, што зрабіць, каб так не было”. І тады бацькі ўжо не прапануюць, можа тое, а можа што яшчэ, а толькі запісваюць: “прашу

да мяне патэлефанаваць, прашу мяне паінфармаваць раз на тыдзень". Падобным метадам ёсць тэлеграма, звычайны фармуляр тэлеграмы з пошты я таксама раздаю бацькам падчас сустрэчаў. Можна таксама зрабіць ксеракопію раззлаванага твару, пад якім бацькі напішуць, чаго б яны не хацелі на бацькоўскіх сходах. Гэта такі спосаб для вызначэння прынцыпаў. Альбо яшчэ інакш: малюнак з знакам "забарона заезду" служыць вызначэнню, пра што публічна мы не размаўляем на бацькоўскіх сходах, або як зрабіць, каб бацькі адчулі сябе бяспечна. Падчас семінару я раздаў калісці бацькам выразку з часопісу з хлопцам на сноўбордзе і прапанаваў, каб кожны з бацькоў напісаў знізу штосці пра зацікаўленасці або пасіі свайго дзіцяці. Такія простыя метады дазваляюць настаўніку зразумець, што насамрэч бацькі ведаюць пра сваё дзіця, бо часам яны не ведаюць ягоных сяброў, не ведаюць, чым яно займаецца. Яны зыходзяць з пазіцыі: "Хай вучыцца, галоўнае, каб было ціха". Важна таксама паставіць сабе пытанне, адразу падчас першай сустрэчы, што ёсць мэтай нашых сустрэч, пра што мы будзем размаўляць на бацькоўскіх сходах. Ці гэта будзе класічнае спатканне пад назвай "Вашае дзіця не вучыцца" альбо "У мяне праблемы з гэтым класам". Мы вызначаем пэўную агульную мэту для класу, для бацькоў, для выхаваўцы, для групы. Добра таксама дапамагчы ўсведаміць бацькам, што будзе, калі мы пачнем паміж сабой змагацца. Вельмі часта бацькі на бацькоўскіх сходах становяцца насуперак настаўнікам, павучаюць іх або не кантралююць эмоцыі. Тут дапамагае ілюстрацыя пластыра, на якой бацькі могуць запісваць ідэі, што рабіць, калі трэба "залячыць" пэўную небяспечную сітуацыю. Усе разам шукаюць развязанне, а не чакаюць, пакуль выхавацелька сама нешта прыдумае. Настаўнік мусіць мець у бацьках саюзнікаў.

*Тут звяртаецца ўвага на сітуацыю, калі ёсць сведамыя настаўнік і бацькі, якія не да канца ведаюць, як мае выглядаць іх прысутнасць у школе. А калі ўявіць адваротную сітуацыю? Бывае ж, што гэта настаўнік не хоча наладзіць кантакт з бацькамі. Што могуць зрабіць бацькі, каб стварыць з настаўнікам адну каманду?*

Не ведаю... Каб я быў бацькам, я б паразмаўляў спачатку з іншымі бацькамі, знайшоў бы нейкую супольную ідэю і прапанаваў бы яе выхаваўцу. Я ўзяў бы на сябе хоць бы частку ягоных абавязкаў. Прыкладам, мы прапануем яму выезд, але бярэм на сябе яго арганізацыю замест прапановы "я прашу арганізаваць нашым дзецям выезд". Выхаваўца – гэта госць, якога запрасіў клас і бацькі ўдзячнасці за тое, што той выхаваўца. Можна яму нават зрабіць які падарунак у выглядзе кнігі або білету ў кіно, як канкрэтны доказ таго, што мы маем да гэтага чалавека шацунак. Каб мяне хтосці кудысці запрасіў ад імя класу, то ў мяне быў бы яшчэ большы запал да працы.

*Значыцца трэба імкнуцца да таго, каб не быць ворагамі?*

Я перакананы, што патрэбныя нетыповыя сітуацыі, каб зламаць стэрэатып бацькоў за партамі. Цяжка прыняць за сябра настаўніка, які стаіць насупраць мяне. Часам дастаткова проста інакш паставіць парты. Тое, што я зрабіў на

занятках рэлігіі: мы сядзім у коле, п'ем гарбату. Гэта ж нікому не замінае, а наадварот толькі дапамагае. Можна патанчыць або раздаць некалькі картак. У мяне на сцяне вісіць звычайная рэклама аўтамабіля з лозунгам "з нетыповых натхненняў атрымоўваюцца вылучныя рэчы". Гэта вельмі добрая думка.

*Дзякую за размову.*

## Змяніць сведамасць

Размова з **Багуславам Пасербскім**, старшынём Заходнепаморскага таварыства бацькоў.

*Як утварылася таварыства?*

Сталела бацькоўская сведамасць і пэўна гэта паўплывала на тое, што паўстала такая арганізацыя. З'явіліся людзі, якія ў асветным асяроддзі пачалі рабіць нешта новае: перш усяго псіхолаг і тэрапеўт Міхал Кавэцкі і дырэктар сярэдняй школы № 61 у Шчэціне Богдан Хэнць. Пачалося з сустрэчаў бацькоўскіх радаў з усіх шчэцінскіх школаў. Актыўнасць гэтых нефармальных груп – бо менавіта такімі яны тады былі – мянялася, то ўзрастала, то спадала. Нарэшце, у 2000-ым годзе сабраныя на адной з чарговых сустрэчаў прыйшлі да высновы, што трэба абраць прадстаўнікоў, якія будуць актыўна дзеіць у кірунку большага ўдзелу бацькоў у жыцці школ. Пасля пэўнага часу было прынятае рашэнне пра фармалізацыю гэтага руху, паколькі нефармальная група не мела доступу да фінансавых сродкаў. Спачатку ўтварылася Шчэцінскае таварыства бацькоўскіх радаў, але пасля рэгістрацыі арганізацыя падзялілася. На пачатку 2002-га году была зарэгістраваная другая арганізацыя бацькоў – Заходнепаморскае таварыства бацькоў.

*З якімі праблемамі Вы сутыкнуліся на пачатку дзейнасці, а якія праблемы маеце цяпер?*

Гэта праблемы ўсё тыя ж, бо насамрэч мы ўсё яшчэ на пачатку дарогі. Надалей не стае сапраўднай актыўнасці бацькоў у школах, няма супрацы настаўнікаў і дырэкцыі школ з бацькамі. Зразумела, сітуацыя па-рознаму выглядае ў розных школах і гэтага нельга абагуліць, але ў цэлым гэта не выглядае найлепей. Бацькі не да канца ведаюць свае правы, зрэшты, як і вучні. Польская школа надалей застаецца герметычнай, зачыненай установай. Яна неахвотна і з вялікім страхам "аддае" бацькам пэўныя абшары сваёй працы. Калі дырэктар кіруе ўстановай, то ён лічыць, што гэта ягоная школа. Бацькі не маюць разумення, якая арганізацыйная сістэма данай установы, якія грошы прызначае ёй самакіраванне і як яны выдаткоўваюцца. Усё тайнае, я сустрэўся нават з такім парадоксам, калі пад таямніцу падпадаў статут. Таму так важна, каб школы пачалі дэмакратызавацца, бо толькі такім чынам з'явіцца шанец на прышчапленне маладым людзям прынцыпаў дэмакратыі. Яны мусяць гэтаму

вучыцца ў школе, тым больш, наша дэмакратыя яшчэ маладая, а прыклады з мас-медыяў не заўсёды вартыя, каб іх пераймаць. Таму навучанне дэмакратыі ёсць місіяй школы.

*Нягледзячы на гэтыя праблемы, ці можаце Вы пахваліцца поспехамі?*

Найбольшым поспехам ёсць тое, што таварыства ўвогуле ўтварылася і дзеіць. Мы выпрацавалі іншае стаўленне да бацькоў, нас ужо не ўспрымаюць як “ашаломаў” або ворагаў. Мы маем імідж людзей, якія хочуць працаваць на карысць асветы. Мы пачалі змену сведамасці.

*Дзякую за размову.*

## ДОМ З ЧАТЫРМА ПАКОЯМІ

Размова з **Даротай Шостак**, дырэктаркай дзяржаўнага дзіцячага садка № 66 “Пад каштанам” у Шчэціне.

*Дзіцячаму садку, якім Вы кіруеце, вызначана было па рашэнні гарадскіх уладаў знікнуць з асветнай мапы Шчэціна. Між іншым, дзякуючы актыўнасці бацькоў, так не сталася. Яны хочуць актыўна ўдзельнічаць у жыцці гэтай установы і змагацца за яе выжыванне падчас пагрозы . Чаму?*

Мне здаецца, што гэта сямейная атмасфера нашага садка паўплывала на тое, што бацькі не пачуваюцца чужымі. Яны таксама ствараюць гэту атмасферу. Мы адкрытыя на іх прапановы, просьбы, заўвагі і яны маюць уплыў на ўсё, што адбываецца ў садку. У нас няма дамафонаў, якія б агароджвалі б нас ад людзей, затое адбываецца шмат сямейных урачыстасцяў, святаў, кірмашоў. Бацькі свабодна ходзяць па садку, бачаць, што мяняецца. Яны бачаць, што ўсе зацікаўленыя, што ўсе ўкладаюць шмат сэрца ў стварэнне гэтага месца. У нашым садку няма нікога, каму б на гэтым не залежала. Усе актыўна ўдзельнічаюць. Таму, калі трэба было замяніць пясок у пясочніцах, то дваццаць бацькаў прыехалі дапамагчы. Дастатковай была маленькая просьба. Калі штосці зламаецца, няма праблемы. Важнай ёсць сістэма інфармавання. Гэта не толькі абвесткі на дошцы, мы выходзім да бацькоў, мы хочам мець з імі непасрэдны штодзённы кантакт. Бацькі проста намі задаволены.

*Але ж штогод у садок прыходзяць новыя бацькі, з сваім досведам, з рознымі паставамі, часта з прэтэнзіямі...*

Я толькі што размаўляла з адной мамай, якая прыйшла да мяне з цэлым пералікам заданняў. Я яе выслухала і буду рэалізоўваць гэтыя заданні, бо часцей ўсяго гэта справы, якія мусяць служыць дзецям. А нашай мэтай ёсць тое, каб дзецям было ў нас як найлепей. Потым дзеіць ужо прынцып узаемнасці: бацькі бачаць, што мы рэалізуем іх просьбы, і адказваюць тым самым.

*І таму яны змагаліся за гэты садок?*

Яны перакананыя, што гэты садок добры і што было б зусім несправядліва, каб яго ліквідавалі.

*У момант небяспекі наступіла яднанне сіл, вялікі клопат з боку бацькоў. Гэта іх вельмі зблізіла.*

У кожнай установе, якая была пад пагрозай, бацькі ядналіся. Але некаторым бацькам дырэктары зусім не дапамагалі. Не дапускалі іх да дакументацыі. Яны баяліся рэакцыі начальнікаў, асветных уладаў горада. Я, з аднаго боку, не спужалася, а другога, працавала згодна з законадаўствам.

*Значыцца Вы мелі настолькі шмат мужнасці, каб разам з бацькамі змагацца за выжыванне, нягледзячы на тое, што гэта не падабалася ўладам. Вам хапіла настойлівасці, каб у гэтым годзе зноў пераконваць радных і чыноўнікаў.*

Калі б гэта ўстанова не была б сапраўды добрай, можа я і не мела б столькі сіл. Сёлета я імкнулася паказаць Радзе гораду, што мы страцім такі, а не іншы дзіцячы садок. Летась мы мелі на гэта занадта мала часу, а акрамя таго ніхто нас асабліва і не пытаў. Тым разам мы мелі прынамсі свае 5 хвілін, каб паказаць сябе. Хтосці нас выслухаў. Але надалей ёсць пагроза ліквідацыі па прычыне нястачы сродкаў.

*Калі б да Вас прыйшоў нехта, хто хацеў бы стварыць у сябе садок з такой цудоўнай атмасферай, што б Вы параілі?*

Што трэба даказаць бацькам, што чалавек дае з сябе ўсё, што магчыма. Што гэта не толькі праца, але таксама і хобі, тое, што падабаецца рабіць. І гэта не толькі адпрацоўка абавязкаў “ад і да” – гэта пакліканне. Іншыя заўважаюць гэтую актыўнасць і пачынаюць паводзіць сябе падобным чынам. Трэба іх далучаць да жыцця садка менавіта такімі ўрачыстасцямі, размовамі, перажываннем таго, што робіцца. І нельга быць дырэктарам, гэта значыць, нельга трымаць дыстанцыю з бацькамі. Мы ўсе ёсць сям’ёй, дарослымі, якія хочуць даць дзіцяці як мага лепшую будучыню праз выхаванне, арганізацыю цікавага часу ў садку, каб дзіця выйшла з яго моцным, з пачуццём бяспекі. Мы ўсе – бацькі і настаўнікі – ствараем свет нашых дзяцей.

*Значыцца Вы стварылі фенамен – свет, у якім дзеці пачуваюць сябе так добра, што не ўяўляюць сабе іншага. А бацькі не ўяўляюць ужо іншага месца для сваіх дзяцей.*

У нашым садку ўсе выхавацелькі, кухары, няні ведаюць усіх дзетак. Гэта кватэра з чатырма пакоямі (садок налічвае 4 групы прыблізна па 25 чалавек кожная – рэд.). Дзіця не пачувае сябе безыменным. Мы цешымся, калі дзіця прыходзіць у садок, і сумуем, калі яно хварэе. Каб дзеці адчувалі, што іх любяць, – гэта наша заданне. Людзі цягнуцца да такіх месцаў, дзе да іх добра ставяцца, а іх дзіця бавіць час бяспечна і прыемна, па магчымасці без стрэсаў. Я проста зачараваная нашымі настаўніцамі, тым, як творча яны працуюць. Яны ведаюць, што я за іх сцяной стану. Некаторыя дырэктары маюць праблемы з

настаўніцамі, а мае нават перавышаюць чаканні. Ужо нават няні пачалі нешта размалёўваць, а кухары ўпрыгожылі кухню і робяць фігурныя піражкі. Яны даюць з сябе ўсё, а нават болей.

*Гэта гучыць так прыгожа, што ажно нерэальна.*

Гэта ўсё магчыма. Важна заснаваць добрую Бацькоўскую раду з добрым рэгламентам. Дырэктары мусяць зрушыць сцяну паміж бацькамі, настаўнікамі, дырэктарам, з аднаго боку, і дзецьмі, з іншага, каб мы ўсе былі на адным баку. Гэта наш садок, нашае жыццё. Давайце створым дзецям цудоўны свет, каб яны як мага цікавей пражылі гады дзяцінства. Калі мы сёння іх добра выхаваем і дамо ім ўсё найлепшае, то пазней мы атрымаем вельмі добрых грамадзян, цудоўных дарослых, без комплексаў і падрыхтаваных да віхураў нашага жыцця.

*Дзякую за размову.*

## ГЭТА МОЖА НАПАТКАЦЬ КОЖНАГА

Размова з **Крысцінай Лапатай**, старшынёй Шчэцінскай філіі Таварыства сем'яў і сяброў "Вяртанне з У".

*Як утварылася таварыства і хто яго заснаваў?*

Таварыства ўтварылася ў 1995 годзе па ініцыятыве бацькоў дзяцей, якія былі залежныя ад наркотыкаў.

*Чаму? Навошта ім гэта было патрэбна?Былі ж адпаведныя ўстановы, якія займаліся гэтай праблемай.*

Гэта было патрэбна, каб даць бяспеку і падтрымку бацькам. Я думаю, што пасля столькіх гадоў спраўджваецца слушнасць гэтай ідэі. Сёння бацькі маюць усё, паданае "на талерцы". У такіх таварыствах, як наша, куды бацькі могуць прыйсці, паскардзіцца, выплакацца, яны знойдуць дапамогу для сябе і для дзіцяці. У нас бацькі і залежныя дзеці атрымоўваюць комплексную дапамогу – ад візіту да лекара да атрымання месца ў рэабілітацыйным цэнтры або тэрапіі ў кансультацыі.

*Магу сабе ўявіць, якім цяжкім быў пачатак. Бацькі ў хаце перажывалі сваю трагедыю, а тут трэба было мабілізаваць сілы, каб прайсці ўсе фармальнасці, здабыць памяшканне і фінансаванне...*

Я магу сказаць пра сябе, бо з першых сябраў таварыства засталіся толькі два чалавекі. Іншыя развязалі сваю праблему і надалей ужо ў працы не ўдзельнічалі. У 1995 годзе маё дзіця лячылася ў цэнтры, а я не мела месца, дзе магла б з кімсці паразмаўляць пра сваю праблему. Часы былі такія, што наркаманія асацыявалася з паталогіяй у сям'і, хоць сёння ўжо ведама, што гэта неабавязкова. Я адчувала сябе горшым чалавекам. Такіх, як я, было болей.

Менавіта гэта і сыграла ролю ў утварэнні таварыства. Нашай мэтай была падтрымка бацькоў, доступ да тэрапіі або лекарская дапамога.

*За гады Вашай дзейнасці Вам удалося зняць чары з гэтай тэмы. Раней наркаманія была тэмай табу, была плямай на людзях, залежных ад наркаманіі, і іх сем'яў.*

Пасля столькіх гадоў досведу чалавек мусіць навучыцца з гэтым усім жыць. Я магу пра гэта спакойна размаўляць і для мяне гэта тэма не ёсць табу. Мне здаецца, што трэба пра гэта гаварыць. Я не саромлюся прызнаць, што маё дзіця ўжывала наркотыкі і выйшла з гэтай залежнасці. Я думаю, што гэта добры прыклад, і бацькі, якія прыходзяць у нашу групу, могуць паверыць, што дзеці могуць выйсці з залежнасці. Нашы дзеці скончылі ВНУ і сталі нармальнымі людзьмі. Яны жывуць, працуюць, вучацца. На апошнім з'ездзе філій "Вяртанне з У" з усёй Польшчы, мы пазнаёміліся з адным чалавекам, які займае высокую пасаду ў ваяводскай адміністрацыі. Гэта быў малады чалавек, які цягам некалькіх гадоў ўжываў наркотыкі. Паглядзеўшы на яго, у чалавеку нараджаецца ўпэўненасць, што варта змагацца, нельга асуджаць гэтых людзей, адкідваць іх і казаць, што яны ўжо страчаныя.

*Сёння Вы дапамагаеце не толькі сабе і сваім дзецям, але выходзіце таксама ў школы і асяроддзі, якія патрабуюць Вашых ведаў.*

Так. Асабліва ў школах на сустрэчах з бацькамі мы распавядаем пра праблематыку наркаманіі. Часта бацькі ўжо нешта ведаюць, нешта падазраюць, маюць пэўныя сігналы, што дзіця ўжывае наркотыкі, але саромяцца пайсці кудысці з гэтай праблемай. Часта таксама яны хаваюць гэты факт так доўга, наколькі гэта магчыма. Часам занадта доўга, і распачынаць змаганне з залежнасцю ўжо запозна. Дзіця перадазуе наркотык. Бацькі мусяць таксама зразумець, што каб дапамагчы дзіцяці, ім трэба пачаць з сябе. Ад кожнай залежнасці, алкагольнай або наркаманіі, павінна лячыцца ўся сям'я. Таму бацькі карыстаюцца кансультацыяй, якую вядзе наша таварыства, групамі падтрымкі альбо адукацыйных груп. Калі лечыцца ўся сям'я, відаць рух наперад і ёсць шанец, што дзіця выйдзе з залежнасці і не будзе вяртанняў. Гэтая мадэль комплекснага лячэння будзе ўводзіцца зараз у такія таварыствы, як наша. На сённяшні дзень заўважаецца тэндэнцыя да закрыцця часткі цэнтраў, а большая ўвага надаецца амбулаторнай апецы. Дзіця застаецца ў сваім асяродку, у сваёй хаце, ходзіць у школу. Важна, каб у кансультацыі быў лекар-псіхіятар, паколькі цяпер моладзь ужывае хімічныя наркотыкі, галоўным чынам, амфетамін, які выклікае псіхічныя змены. Потым назіраюцца паслянаркотыкавыя псіхозы, а часта і шызафрэнія.

*Які маштаб гэтай з'явы? Ці якое-небудзь асяроддзе можа быць вольнае ад гэтай залежнасці?*

Шчэцін стаіць на чале непахвальнага спісу, калі казаць пра залежнасці. Гэта звязана з спецыфікай нашага размяшчэння побач з заходняй мяжой, акрамя

таго гэта портавы горад. Таму тут і большы доступ да наркотыкаў. Моладзь узалежнена галоўным чынам ад амфетаміну і марыхуаны – так, так, хай ніхто не думае, што марыхуана не ўзалежняе! Марыхуана і гашыш найчасцей купляюцца ў Галандыі, дзе яны дазволены ў продаж у адмысловых крамах, і перавозяцца кантрабандай у Польшчу. Больш развітыя краіны не далі рады з праблемай наркаманіі, таму хутчэй ніякае асяроддзе не можа быць вольным ад залежнасці. Асабліва за нашай усходняй мяжой. Пацыенты з-за ўсходняй мяжы лечацца ў нашых цэнтрах, асабліва тых, якія вядзе MONAR (гэта арганізацыя, заснаваная ўжо памерлым Маркам Катаньскім, для дапамогі наркаманам).

*Дзякую за размову.*

*Пераклад з польскай мовы Наталлі Маліноўскай*

Ірына Клевец

# РОЛЯ КЛАСНАГА КІРАЎНІКА Ў СУПОЛЬНАЙ ПРАЦЫ НАСТАЎНІКАЎ І БАЦЬКОЎ

(роздум класнай кіраўнічкі і маці)

Ці часта, калі настаўнік атрымлівае класнае кіраўніцтва, ён задумваецца пра сваю ролю? Не, не пра свае функцыянальныя абавязкі, а менавіта пра тое, кім ён будзе для сваіх вучняў, для іх бацькоў, для іншых настаўнікаў, якія працуюць у гэтым класе? У гэтым навучальным годзе я апынулася ў ролі маці і класнай кіраўнічкі адначасна (я – класная кіраўнічка ў класе, дзе вучыцца мая дачка). Часта даводзілася пераключацца з адной ролі на другую – гэта дало падставу для разваг аб ролі класнага кіраўніка ў супольнай працы настаўнікаў і бацькоў.

Хочацца зрабіць акцэнт на слове “супольнай”. Бо, на мой погляд, рухальнай сілай выхаваўчага працэсу ёсць развязанне супярэчнасці паміж разнастайнымі (якія часта дзеюць у розных напрамках) уздзеяннямі на вучня і цэласным фармаваннем яго асобы.

Сістэма выхавання з аднаго боку псіхолага-педагагічная (уплывае праз настаўнікаў, урокі, падручнікі, класныя гадзіны), а з іншага – сацыяльна-педагагічная і дзеіць у большай ступені як сацыяльны фактар (праз адносіны паміж дзецьмі, настаўнікамі, бацькамі, праз псіхалагічны клімат у класным калектыве, які дазваляе з’яднаць дзяцей і дарослых).

Мне падаецца, што класны кіраўнік – гэта рэгуліроўнік, які стаіць на скрыжаванні дарог, па якіх крочаць розныя людзі: вучні, іх бацькі, настаўнікі, якія працуюць у гэтым класе. Рэгуліроўнік можа стварыць нярвовае, хаатычнае становішча на скрыжаванні, а можа з прыемнай усмешкай ствараць зладжаны рух гэтых плыняў. Хто, як не класны кіраўнік, у параўнанні з іншымі педагогамі, больш ведае пра сем’і вучняў, больш кантактуе з імі. Калі ў дзіцяці тыя ці іншыя праблемы (у школе, дома, з іншымі дзецьмі), бацькі пераважна спачатку звяртаюцца да класнага кіраўніка, а ўжо потым да адміністрацыі або да спецыялістаў-псіхолагаў. Гэта невыпадкова: ён больш ведае пра сваіх вучняў. Класны кіраўнік мусіць:

- рэгулярна праводзіць бацькоўскія сходы і індывідуальныя кансультацыі з бацькамі;
- інфармаваць бацькоў пра поспехі ў вучобе іх дзяцей;
- праводзіць сумесныя мерапрыемствы з бацькамі;
- прыцягваць бацькоў да ўдзелу ў развязанні школьных праблем;
- усталёўваць кантакты бацькоў з школьным псіхолагам, і іншае.

На першы погляд усё проста і зразумела.

Што галоўнае ў дзейнасці класнага кіраўніка? Я лічу – выхаванне вучняў і згуртаванне іх у сяброўскі калектыў. Сёння патрэбна, каб у педагогіку вярнуліся ідэі важнасці і значнасці дзяцінства, супрацы, дыялогу, самаактуалізацыі і самавызначэння асобы. Значанне гэтых паняткаў нават адлюстравана ў дакументах, якія вызначаюць дзяржаўную палітыку ў сферы адукацыі. Гэтыя дакументы звяртаюць увагу класнага кіраўніка на неабходнасць каардынацыйнага ўзаемадзеяння ўсіх удзельнікаў выхаваўчага працэсу: вучняў, педагогаў, бацькоў. Але, на жаль, у гэтых паперах няма адказу на пытанне: *як гэта зрабіць?* І тыя з класных кіраўнікоў, хто спрабаваў працаваць у даным кірунку, могуць пагадзіцца – цяжкасцяў шмат. Нехта сказаў: “У працы з дзецьмі сама цяжкае – праца з дарослымі”.

Вельмі часта бацькі прыходзяць на бацькоўскі сход неахвотна, з думкай як мага хутчэй пайсці дахаты. На жаль, у большасці сваёй, бацькі хацелі б думаць, што толькі школа мусіць выхоўваць іх дзяцей, а з іх дастаткова таго, што яны апранаюць і кормяць сваё дзіця.

Магчыма, гэта брак часу на кантакты з школай, небачанне перспектыў, а галоўнае – патрэбы супольнай працы бацькоў і настаўнікаў, недавер да школы, да настаўніка. А з іншага боку – незацікаўленасць у развязанні данай праблемы самога настаўніка, афіцыйнасць зносінаў, брак камунікацыйных уменняў у настаўніка і бацькоў, псіхалагічныя бар’еры ... Можна было б доўжыць гэты пералік. Прычым прычынаў шмат, але на мой погляд, сама важныя з іх:

- брак добрых традыцыяў паміж бацькамі і настаўнікамі (бацькі і настаўнікі, як бы стаяць па розныя бакі поля, падобна гульцам, якія толькі рыхтуюцца гуляць разам, пільна ўглядаючыся адзін на аднаго; але калі гэта гульня адбудзецца няведама);
- брак бацькоўскага згуртавання, якое б магло рэальна дапамагаць настаўнікам; без актыўных згуртаваных бацькоў няма працавітай адміністрацыі школы. Мы гаворым пра вучнёўскае самакіраванне і амаль ніколі не гаворым пра бацькоўскае самакіраванне. А між тым вельмі часта гучыць прапанова, што школа мусіць быць не аўтарытарнай, а дэмакратычнай, (у большасці сваёй, на жаль, бацькі лічаць, што яны аддалі сваё дзіця ў школу і няхай настаўнік вучыць яго і выхоўвае, як мага менш пры гэтым турбуе бацькоў).

Найважнейшая роля класнага кіраўніка – пераканаць бацькоў пра важнасць і неабходнасць іх выхаваўчай працы супольна з настаўнікамі. Бо толькі бацькі могуць ведаць сваё дзіця лепш за ўсіх. Выхаванне – гэта працэс, які патрабуе ўдзелу двух бакоў: бацькоў і настаўнікаў.

Але патрэбен новы стыль супрацы з бацькамі, дэмакратычны характар сустрэч, утульная прыязная атмасфера. Трэба паглядзець на бацькоўскі сход як на сустрэчу партнёраў – асобаў, якія разам выхоўваюць дзяцей. Неабходна змена формы кантактаў з бацькамі: сустрэчы па пэўнай тэматыцы, што цікавіць бацькоў, а не толькі інфармацыя пра адзнакі і складкі; пазітыўную інфармацыю выказваць на сумесных сходах з дзецьмі. Мяркую, што бацькі хацелі б бачыць

класнага кіраўніка не як інфарматара пра вучэбныя поспехі або няўдачы іх дзяцей, а як зычлівага дарадцу, чалавека, дасведчанага ў навучанні і выхаванні дзяцей.

Мне хацелася б, каб гэты матэрыял стаў пэўнай дапамогай тым класным кіраўнікам, якія хочуць працаваць па-новаму. З асабістага досведу хачу папярэдзіць, што значна лягчэй працаваць, калі бачыць у бацьках сваіх вучняў аднадумцаў. І галоўнае – супраца на падставе павагі і паразумення.

Як часцей за ўсё адбываюцца бацькоўскія сходы? Бацькі садзяцца за парты, перад імі выходзіць класны кіраўнік і далей ... гадзіна ці дзве добра рыхтаванага маналогу. Ці часта атрымліваецца дыялог на бацькоўскім сходзе? На жаль, не. Найчасцей бацькі прыходзяць паслухаць, што будзе гаварыць класны кіраўнік, а не паўдзельнічаць у размове. Яны ў меншай ступені гатовы да супольнага дыялогу, не хочуць і не ўмеюць размаўляць на бацькоўскім сходзе.

На адным з бацькоўскіх сходаў я прапанавала бацькам напісаць тыя праблемы, якія ёсць у стасунках з іх дзецьмі. Такім чынам, у нас выявілася агульная праблема: “Непаразуменне”. Гэта стала тэмай наступнага бацькоўскага сходу. Разам з бацькамі мы спрабавалі развязаць гэтую праблему працуючы ў групах і ўяўляючы сябе дрэсіроўнікамі канарэйкі, тыгра, ляніўца. Што трэба ведаць дрэсіроўніку, каб дабіцца добрага выніку, каб зразумець жаданні іншай істоты, якая адрозніваецца ад цябе па многіх уласцівасцях? Праз абмеркаванне мы прыйшлі да высновы: патрэбны жаданне, цярпенне, час, а яшчэ веды. І таму на наступным бацькоўскім сходзе выступаў псіхолаг, які расказваў пра псіхалагічныя асаблівасці дзяцей падлеткавага веку. Яго ўдзел быў пільнай патрэбай, якую адчулі бацькі.

А ці ведаюць бацькі вучняў вашага класу адзін аднаго? Ці была ў іх, наагул, магчымасць пазнаёміцца? Гэтую магчымасць можа стварыць класны кіраўнік. Першы бацькоўскі сход у маім класе так і называўся “Давайце пазнаёмімся!”. Даць магчымасць бацькам расказаць пра сябе, пра сваё дзіця, пра свае здольнасці і магчымасці, пра свае захапленні – няўжо гэта не можа быць тэмай бацькоўскага сходу?

А чаму, калі бацькі прыходзяць на сход, яны абавязкова мусяць сядзець за партамі? Можна для размовы паставіць сталы ці крэслы наўкола. Вы ўбачыце, што гэты просты прыём змяняе становішча на бацькоўскім сходзе! Класны кіраўнік таксама ўдзельнічае ў размове і першы раскажа пра сябе, пра сваю сям’ю і свае захапленні. А калі вы прапануеце па кубачку гарбаты – вось і зламаны першыя крыгі лёду недаверу паміж класным кіраўніком і бацькамі. А вы даведаліся хто з бацькоў дапаможа правесці розныя класныя мерапрыемствы.

На адным з бацькоўскіх сходаў мы пастанавілі, што за гады вучобы ў старэйшых класах вучні пазнаёмяцца з прафесіямі бацькоў. І зараз, калі мы прыходзім на экскурсію на прадпрыемства, у лабараторыю, дзе працуюць бацькі маіх вучняў, і бацька ці маці самы расказваюць пра сваю працу – я ведаю ў каго больш гонару ў вачах: у бацькоў ці дзяцей, чые бацькі праводзяць

экскурсію. Акрамя таго, такое знаёмства з прафесіямі – добрая падстава для прафесійнай арыентацыі.

У Дзень Маці я раздала сваім вучням канверты з чыстымі аркушамі паперы і папрасіла іх напісаць ліст да сваёй маці, падпісаць канверт і ўвечары аддаць маці. Ведаеце, у многіх маіх вучняў у вачах было здзіўленне: “Што пісаць?”. Але потым знайшліся словы падзякі, прабачэння, любові. На наступным бацькоўскім сходзе матулі казалі, што гэта быў самы дарагі падарунак. Цікавым было тое, што дзеці захацелі такія ж лісты напісаць і сваім татам. Мы дамовіліся, што абавязкова зробім гэта.

Ліставанне становіцца добрай традыцыяй у нашым класе. Гэта могуць быць лісты бацькоў да сваіх дзяцей, лісты вучняў да настаўнікаў або настаўніка да вучняў, гэта можа быць калектыўны ліст-зварот дзяцей да бацькоў і інш.Такая форма стасункаў дазваляе падумаць і разабрацца ў многіх сітуацыях, падумаць над кожным словам, якое б ты хацеў сказаць іншаму чалавеку.

У сваёй працы я сутыкнулася яшчэ з адной праблемай: вучні не хочуць супрацы “настаўнікі-бацькі”. Важна паказаць вучням, што бацькі не толькі не замінаюць, але без іх удзелу, наагул, немагчыма праводзіць многія класныя мерапрыемствы.

Летам мінулага году наш клас збіраўся ў вандроўку. Паход з начоўкай у палатках у лесе на беразе возера, з цікавымі экскурсіямі абяцаў быць захапляючым. Дзеці вельмі хацелі гэтай вандроўкі, сур’ёзна рыхтаваліся да яе, размяркоўвалі абавязкі. Але была адна дамова – у вандроўку мы пойдзем толькі разам з бацькамі. Першая рэакцыя была адмоўнай: “Навошта нам патрэбны бацькі ў паходзе, мы самы можам усё зрабіць!”. Першая рэакцыя бацькоў на пытанне “Хто пойдзе з намі ў паход?” – апушчаныя вочы і цішыня ў класе, а потым размовы пра брак часу і думкі пра тое, што прысутнасць бацькоў у паходзе толькі будзе перашкаджаць вучням. Усё ж дамова засталася ў сіле, а да вандроўкі быў яшчэ месяц часу. Дзеці, якім вельмі хацелася прайсці з заплечнікам, пасядзець ля вогнішча, пачалі ўгаворваць бацькоў.

На наступным бацькоўскім сходзе мы разам з бацькамі абмяркоўвалі маршрут і праграму вандроўкі. Урэшце ў вандроўцы ўзялі ўдзел 20 вучняў і 15 бацькоў! Не ўсе бацькі ішлі разам з намі 20 км. Хто прыехаў увечары на стаянку да вогнішча, хто дапамог арганізаваць цікавую экскурсію і футбольны матч паміж татамі і хлопчыкамі, а хто пад’ехаў нараніцы каб даведацца як у нас справы і прывёз смачныя прысмакі для ўсіх. А як цікава было гуляць з бацькамі ў розныя гульні ля вогнішча, як справядліва ацэньвала камісія конкурс палатак; як хвалілі бацькі паходную кашу, згатаваную дзяжурнымі! А адзін тата ў ролі Цара лесу выклікаў неапісальнае захапленне на пасвячэнні ў турысты, якое тайна ад дзяцей рыхтавалі бацькі. Я лічу, што сама галоўны вынік нашай вандроўкі (і дзеці таксама казалі пра гэта на падсумаванні ў канцы паходу), што, “аказваецца бацькі зусім не перашкаджаюць адпачываць!”. “Наадварот, з імі вельмі цікава!” Здаецца, што можа змяніць адна вандроўка? А мне значна лягчэй стала працаваць з вучнямі і іх бацькамі.

Наступны навучальны год пачаўся з размовы пра правы і абавязкі бацькоў і іх дзяцей. Гэта быў агульны бацькоўскі сход з дзецьмі, на якім супольна працавалі ў групах бацькі і дзеці. Вынікам нашага сходу была “хартыя бацькоў” і “хартыя дзяцей”. На падсумаванні сустрэчы бацькі і вучні казалі пра тое, што ў выніку абмеркавання хартыі ўдалося развязаць мірным шляхам многія праблемы.

Вельмі шмат залежыць ад стасункаў, што ёсць паміж бацькамі і настаўнікамі-прадметнікамі, якія працуюць у гэтым класе. Гэтыя стасункі будуць складвацца добра, калі настаўнікі і бацькі не толькі будуць ведаць адзін аднаго, але і зычліва, з павагай ставіцца адзін да аднаго і да дзяцей таксама. І не толькі настаўнік-прадметнік, прыйшоўшы на бацькоўскі сход, будзе распавядаць бацькам пра цяжкасці выкладання свайго прадмету ў гэтым класе, ці пра праблемы вучняў, але і бацькі змогуць расказаць настаўніку, якія ёсць цяжкасці ў іх дзяцей з гэтым прадметам. Тады з’явіцца магчымасць разам абмеркаваць гэту праблему. Сумесны сход бацькоў і настаўнікаў якраз дае такую магчымасць. Ён можа быць арганізаваны як групавая праца па методыцы “Дыванок ідэй” з тэмай: “Стасункі “бацькі – настаўнікі” ў нашым класе не складаюцца добра, бо: ...

Галоўнае, каб гэта сустрэча стала не прад’яўленнем прэтэнзій, а сумесным абмеркаваннем з прапановай канкрэтных мераў па развязанні існых праблем. Цікава, што тэму гэтага бацькоўскага сходу прапанавалі самы бацькі. А бацькоўскі камітэт дапамагаў рыхтаваць праграму сходу і запрашэнні настаўнікам-прадметнікам.

Вялікае значанне маюць індывідуальныя кансультацыі з бацькамі. Трэба помніць, што гэта кансультацыя, а не спосаб выказаць прэтэнзіі да бацькоў і іх дзяцей.

Вельмі часта складваецца такая сітуацыя, што бацькі хацелі б пачуць ад класнага кіраўніка, настаўнікаў адказ на пытанні: чаму яго дзіця не спраўляецца з вучобай, чаму не расказвае дома пра справы класу і шмат іншых адказаў на многія пытанні. Але бацькі не заўсёды гатовыя да таго, каб найперш самым пачаць развязваць гэтыя пытанні! Часцей яны чакаюць, што класны кіраўнік, або настаўнікі-прадметнікі без іх дапамогі самы справяцца з праблемай. Але для выхавання патрэбныя два бакі: настаўнікі і бацькі. Нестандартныя бацькоўскія сходы з выпрацоўкай агульнай праграмы дзеянняў, з агульным абмеркаваннем праблем дапамагаюць бацькам задумацца і зразумець гэта. Сістэма такіх бацькоўскіх сходаў не толькі выклікае цікавасць у бацькоў, але і дапамагае супольна развязваць важныя пытанні школьнага жыцця. Тады паўстае неабходнасць бацькоўскіх сустрэч, бацькоўскага лекторыя з удзелам спецыялістаў па праблемах падлеткавага веку і, магчыма, не трэба будзе доўга ўгаворваць бацькоў пайсці з вамі ў вандроўку ці дапамагчы арганізаваць іншыя справы класу.

Анкетаванне паказала, што большасць бацькоў бачаць праблему сацыяльнай і псіхалагічнай абароны дзяцей як комплексную праблему – сацыяльная

абарона дзяцей дзяржавай, добрыя культурна-бытавыя ўмовы ў сям'і, спрыяльны псіхалагічны клімат, узаемадзеянне бацькоў і школы. Многія з аспектаў развязання гэтай праблемы залежаць ад настаўнікаў і бацькоў. Гэта вельмі важна – сацыяльная і псіхалагічная абарона нашых дзяцей! Таму ёсць сэнс працаваць разам. Я ўпэўнена, што толькі кантакт бацькоў, дзіцяці, настаўнікаў дае станоўчы вынік у выхаванні і навучанні вучня. Многае залежыць ад бацькоў. Калі яны зацікаўленыя ў будучым свайго дзіцяці, то яны мусяць найперш цікавіцца поспехамі ці неўдачамі свайго дзіцяці ў школе. Многа залежыць ад настаўнікаў. Наколькі яны ведаюць вучняў, іх бацькоў, наколькі хацелі б дапамагчы вучням у развязанні іх праблем.

І вельмі шмат залежыць ад класнага кіраўніка. Наколькі ён зможа скаардынаваць дзеянні бацькоў, настаўнікаў і дзяцей. На мой погляд няма другой асобы ў школе, якая б на роўні класу магла развязаць даную праблему.

Я прывяла толькі некаторыя прыклады мерапрыемстваў якія дапамагаюць каардынаваць дзеянні ўсіх бакоў выхаваўчага працэсу. Не ўсё атрымлівалася адразу, не ўсё атрымліваецца і цяпер. Але я помню словы аднаго з бацькоў маіх вучняў на апошнім бацькоўскім сходзе: “Гарманічнае выхаванне нашых дзяцей – гэта агульная справа бацькоў і настаўнікаў. Яно нас яднае, таму мы заўсёды развяжам любыя праблемы і канфлікты”. Таму, магчыма, усё што мы робім – гэта немарна страчаны час.

## Парады:

### Рыхтоўля бацькоўскага сходу

1. Вызначыць тэму, галоўную праблему і асноўныя заданні сходу.
2. Удакладніць рэгламент, прадумаць ход бацькоўскага сходу.
3. Разаслаць бацькам паважлівыя запрашэнні з пералікам пытанняў, якія будуць абмяркоўвацца на сходзе.
4. Прадумаць дзе будуць распранацца бацькі, хто і як сустрэне іх у школе.
5. Прадумаць выставачны або інфармацыйны матэрыял.
6. Вызначыць, каго з настаўнікаў-прадметнікаў, або іншых спецыялістаў можна запрасіць на сход.
7. Падумаць пра свой знешны выгляд.

### Правілы паводзінаў класнага кіраўніка на бацькоўскім сходзе

1. Зняць напружанне, трывогу, чаканне непрыемнай размовы.
2. Даць бацькам адчуць вашую павагу і ўвагу да іх.

3. Даць разуменне, што ў школы і сям'і – адны праблемы, адны задачы і адны дзеці.
4. Падказаць як знайсці выйсце з праблемных сітуацый. Пашукаць гэтыя шляхі разам.
5. Пастарацца зразумець бацькоў, уявіць сябе на іх месцы.
6. Умець размаўляць з бацькамі спакойна, паважна, зычліва, зацікаўлена. Вельмі важна, каб бацькі моцных і слабых вучняў або дэвіянтных дзяцей выходзілі з бацькоўскага сходу з верай у сваё дзіця.

**Некаторыя сакрэты поспеху бацькоўскага сходу**

1. Можна расставіць сталы і крэслы па коле: усе будуць добра бачыць і чуць адзін аднаго.
2. Падрыхтаваць візітоўкі з імёнамі бацькоў, асабліва калі яны яшчэ не ведаюць адзін аднаго.
3. Выкарыстоўваць форму размовы за кубкам кавы або гарбаты.
4. Вызначыць адну сама галоўную праблему размовы і на яе абмеркаванні ладзіць бацькоўскі сход.
5. Вызначыць рэгламент сходу. Ашчаджаць час бацькоў.
6. Умела вызначыць дзень і час бацькоўскага сходу (тады, калі няма значных падзей або сітуацый, цікавых тэлеперадач і г. д.).
7. Прыдумайце свае простыя правілы бацькоўскага сходу, давядзіце іх да ведама бацькоў, прыкладам:
   - здымаць верхнюю вопратку абавязкова;
   - не адмоўчвацца;
   - адхіляючы прапанову, трэба зрабіць іншую;
   - маўчаць, калі хто-небудзь прамаўляе;
   - называць адзін аднаго па імені і імені па бацьку, а не "Каціна мама...".
8. Выкарыстоўваць групавыя формы работы бацькоў, гульнёвыя элементы.
9. Абапірацца на досвед, меркаванне аўтарытэтных бацькоў.
10. Пажадана каб бацькоўскі сход скончыўся канкрэтнай пастановай.

**Ірына Клевец** – настаўніца гімназіі, жыве ў Смаргонях. Аўтарка шэрагу публікацый па праблемах адукацыі і выхавання, удзельніца і пераможца многіх конкурсаў.

## Змест

Прадмова (Пшэмыслаў Фенрых, Уладзімір Хільмановіч) .................................... 3

Віктар Сазонаў
Выхаваць Чалавека ........................................................................................ 5

Богдан Хэнць
Паміж правам і рэчаіснасцю ........................................................................ 12

Вольга Ахрук
Кіраванне і самакіраванне ў беларускай школе –
магчымасці і ўплыў грамадства................................................................... 16

Міхал Юзаф Кавэцкі
Дэкалог дыялогу ў беларускай школе ......................................................... 24

Габрыеля Вятр
Школа як люстэрка ........................................................................................ 27

Лявон Карповіч
Знайсці пункт адліку...................................................................................... 31

Справа сапраўды агульная
(размовы Габрыелі Вятр пра адукацыю) ..................................................... 36

Ірына Клевец
Роля класнага кіраўніка ў супольнай працы настаўнікаў і бацькоў ...................... 44